НАШЫ
СЛАВУТЫЯ
ЗЕМЛЯКІ

Ала Раманчук
Валер Ярмоленка

# АРХОНТ МЁРТВАГА ГОРАДА



НАШЫ
СЛАВУТЫЯ
ЗЕМЛЯКІ

*Серыя акадэмічная. Заснаваная ў 1988 годзе*



Ала Раманчук
Валер Ярмоленка

# АРХОНТ МЁРТВАГА ГОРАДА

## Кароль Касцюшка-Валюжыніч

МІНСК
«ТЭХНАЛОГІЯ»
2017

УДК 902/904(47+57)(092)+929Касцюшка-Валюжыніч
ББК 63.4(2)
Р21

Галоўны рэдактар серыі
*Зьміцер Санько*

*На франтыспісе – партрэт
Караля Касцюшкі-Валюжыніча.
Здымак канца XIX – пачатку XX ст.*

**Раманчук, А.**

Р21 Архонт мёртвага горада : Кароль Касцюшка-Валюжыніч / Ала Раманчук, Валер Ярмоленка. – Мінск : Тэхналогія, 2017. – 61 с., [9] арк. іл., партрэт. – (Нашы славутыя землякі).

ISBN 978-985-458-288-7.

У кнізе апавядаецца пра жыццё і дзейнасць Караля Касцюшкі-Валюжыніча (1847–1907) – славутага археолага, заснавальніка і першага дырэктара музея старажытнага Херсанеса, пра яго сенсацыйныя адкрыцці, сярод якіх гарадская брама, храм зківотам, стэла з Прысягай херсанесцаў, "базіліка ў базіліцы", вежа Зянона.

Для шырокага кола чытачоў.

**УДК 902/904(47+57)(092)+929Касцюшка-Валюжыніч**
**ББК 63.4(2)**

**ISBN 978-985-458-288-7**

© Раманчук А.,
Ярмоленка В., 2017
© Афармленне. НВК
"Тэхналогія", 2017

# ПРАДМОВА

На паўночным беразе Чорнага мора, якое калісьці называлася Понтам Аксінскім – Негасцінным морам, але па меры асваення яго абшараў элінамі стала называцца Эўксінскім – Гасцінным, размяшчаліся шматлікія гарады, і адзін з іх – Херсанес. Яму належыць асаблівае месца ў гісторыі народаў, якія насялялі землі Усходняй Еўропы. Тут, у Корсуні – пад такім назовам Херсанес згадваецца ва ўсходнеславянскіх летапісах, – больш за тысячу гадоў таму адбылася падзея, якая мела вялікае цывілізацыйнае значэнне: менавіта тут узяў хрост князь Уладзімір. Адсюль святло хрысціянства распаўсюдзілася па Кіеўскай Русі.

Адным з тых, хто пранікаў у таямніцы гістарычнага развіцця Херсанеса, быў наш суайчыннік – Кароль (Карл) Касцюшка-Валюжыніч. Дзейнасць яго – сістэматычныя раскопкі херсанескага гарадзішча і стварэнне музея (Сховішча старажытнасцяў) – сённяшнім ягоным землякам малавядомая. Але прыслухаймася да слоў тых людзей, якія мелі магчымасць ацаніць ягоны ўклад у вывучэнне руін старажытнага горада ў гады, калі ён працаваў у Херсанесе.

У пачатку XX стагоддзя на старонках адной з сталічных расейскіх газет з'явіўся вялікі артыкул пра раскопкі ў Херсанесе, у якім гаварылася: "Гэты перакананы, праніклівы і энергічны навуковец заслугоўвае таго, каб яго ведалі і памяталі ўсе, хто цікавіцца справай археалогіі ў Расеі ўвогуле і асабліва лёсам Херсанеса, – гэта К. К. Касцюшка-Валюжыніч, сябар-карэспандэнт Імператарскай археалагічнай камісіі, загадчык раскопак і Сховішча старажытнасцяў у Херсанесе".

Дзякуючы раскопкам К. Касцюшкі-Валюжыніча сталі вядомымі шматлікія хрысціянскія храмы і квартальныя капліцы, прасочана лінія фартыфікацыйных збудаванняў, якія абаранялі горад ва ўсе перыяды яго існавання. Гэтыя матэрыялы, як і адкрытыя ім жылыя памяшканні, вуліцы, калодзежы для вады, рыбазасольныя цыстэрны, вадасцёкі і рэшткі водаправода, сталі істотным укладам

у аднаўленне тапаграфіі горада, пра які археолаг і вайсковы інжынер, стваральнік Графскай прыстані ў Севастопалі і партовых збудаванняў у Ялце А. Бэрцье-Дэлягард (1842–1920) пісаў: "У Херсанесе нам адкрываецца ўвесь побыт, уся культура візантыйскага горада. Гэта тым больш важна, калі ўспомніць яго значэнне ў нашай гісторыі, палітычнай і асабліва царкоўнай".

Мастак Д. Струкаў, які наведаў Крым у 1876 годзе, пісаў пра стан справаў у Херсанесе: "Для захавання помнікаў Херсанеса розныя таварыствы ўжываюць нейкія захады, але ў выніку выяўляецца: бяздзейныя выканаўцы, не разумеючы важнасці і значэння аховы даўніны, у бальшыні выпадкаў не знаёмыя з прыкметамі, паводле якіх адрозніваюць старажытныя прадметы, што маюць гістарычнае значэнне, ад прадметаў, не вартых захоўвання, – не могуць выканаць патрабаванні ўказаў, распараджэнняў, таму ў наш час у храмах і манастырах помнікі даўніны знішчаюцца або пераходзяць за бесцань скупшчыкам". Гэтыя словы толькі збольшага сведчаць пра тыя цяжкасці, з якімі сутыкнуўся К. Касцюшка-Валюжыніч, і пра тыя праблемы, якія яму давялося вырашаць, калі ён у 1888 годзе быў прызначаны адказным за раскопкі ў Херсанесе.

К. Касцюшку-Валюжынічу не належаць такія сенсацыйныя адкрыцці, пра якія пісала сусветная прэса пад час раскопак Г. Шлімана ў Троі. Ягоная заслуга ў іншым: у паслядоўным "прачытанні" старонак мінулага аднаго з элінскіх цэнтраў, які ўзнік у эпоху Вялікай грэцкай каланізацыі ў Паўночным Прычарнамор'і, і ў захаванні яго помнікаў.

Херсанес нашых дзён – гэта не толькі гарадзішча, унесенае ў 2013 годзе ў спіс аб'ектаў Сусветнай культурнай спадчыны ЮНЭСКО. Херсанес стаў адным з найбуйнейшых навукова-даследчых цэнтраў, дзе працуюць гісторыкі з розных краін і праходзяць практыку студэнты вышэйшых навучальных устаноў, у тым ліку Уральскага федэральнага ўніверсітэта (Екацярынбург). Маладыя людзі прыязджаюць з далёкага ад Крыма горада, які ў гады Другой сусветнай вайны стаў прытулкам для знаходак Херсанеса.

Гэта адзіны комплекс – музей пад адкрытым небам: гарадзішча і буйная экспазіцыя. І сярод знаходак, экспанаваных у антычнай і сярэднявечнай залах, істот-

нае месца займаюць артэфакты, знойдзеныя ў зямлі К. Касцюшкам-Валюжынічам.

Аўтары спадзяюцца, што чытачы атрымаюць уяўленне пра жыццёвы шлях Караля Касцюшкі-Валюжыніча, наколькі дазваляюць старонкі гэтага кароткага нарыса, змест якога грунтуецца пераважна на матэрыялах архіваў. Рыхтуючы яго, мы трымаліся парады гісторыка часоў Аляксандра Македонскага Калісфена: "Таму, хто спрабуе пісаць што-небудзь, варта, не беручы фальшывага тону, проста выкладаць факты сваёй мовай, як гэтага патрабуюць апісаныя справы".

* * *

Пад час падрыхтоўкі выдання мой суаўтар Валер Ярмоленка сышоў на вечны супакой. Нас пакінуў чалавек, які вельмі шмат зрабіў для папулярызацыі ўкладу беларусаў у сусветную навуку і культуру. Няхай жа наша з ім супольная праца ляжа галінкай лаўра на алтар навукі як памятка пра ўсё зробленае гэтым вялікім патрыётам Беларусі.

*Ала Раманчук*

# СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ СТАРАЖЫТНАГА ХЕРСАНЕСА

*Развіты грэцкі поліс * Пагроза з боку суседзяў * Страта аўтаноміі * "Перліна ў кароне Візантыйскай імперыі" * З'яўленне першых хрысціянскіх храмаў * Калыска праваслаўнай веры * Росквіт і заняпад старажытнага горада * Аддадзены агню і мячу*

Херсанес Таўрыцкі (стар.-грэц. *Χερσόνησος* – паўвостраў; у візантыйскі час – Херсон, які на генуэзскіх мапах пазначаўся як Сарсона) размяшчаўся на Гераклейскім* паўвостраве, складовай частцы Крыма. На працягу дзвюх тысяч гадоў Херсанес быў значным палітычным, эканамічным і культурным цэнтрам Паўночнага Прычарнамор'я.

Верагодна, Херсанес быў заснаваны ў апошняй чвэрці VI стагоддзя да Нараджэння Хрыстова. Праз стагоддзе пасля заснавання горад заняў плато паміж цяперашнімі Каранціннай і Пясочнай бухтамі, пазней межы дзяржавы даходзілі да сучаснай Еўпаторыі і мыса Тарханкут – у яе склад уваходзілі Калос Лімен (Цудоўная гавань) і Керкінітыда, адкуль херсанесцы атрымлівалі хлеб. Гэта быў тыповы грэцкі поліс – рабаўладальніцкая рэспубліка з дэмакратычнай формай кіравання.

Горад меў шырокія гандлёвыя сувязі: з Малой Азіі, астравоў Эгейскага мора і гарадоў мацерыковай Грэцыі везлі высакаякасныя віны і аліўкавы алей, мармур, размаляваны посуд і некаторыя прадметы раскошы. Херсанесцы былі пасярэднікамі ў гандлі з варварамі, што жылі на поўнач ад іх. Значную долю экспарту складалі скуры, жывёла, футры, мёд, воск і, магчыма,

---

* *Па назове метраполіі Херсанеса – Гераклеі Пантыйскай, што ляжала на паўднёвым беразе Чорнага мора.*

збожжа. Тэрыторыя Гераклейскага паўвострава (бліжэйшая хора* поліса) была размежаваная – тут знаходзіліся надзелы і сядзібы, на якіх зелянелі вінаграднікі і сады, раслі агародныя культуры. У Херсанесе атрымалі развіццё і рамёствы: ганчарная, кавальская, ліцейная, будаўнічая і кастарэзная справы. Жыхары горада былі выдатнымі мараходамі і рыбакамі.

Херсанесцы мелі і ўласных гісторыкаў. Аднаму з іх – Сірыску, які праўдзіва апісаў узаемастасункі дзяржавы з Баспорскім царствам, – грамадзяне прысвяцілі адмысловы дэкрэт (другая палова III стагоддзя да Нар. Хр.).

Мірную працу часам парушалі напады суседзяў: з поўначы – скіфаў, з усходу – баспорскіх цароў. Прасоўванне скіфаў прывяло ў другой палове II стагоддзя да Нар. Хр. да страты Керкінітыды (далейшая хора дзяржавы); быў разбураны Калос Лімен, і херсанесцы былі вымушаныя звярнуцца па дапамогу да пантыйскага цара Мітрыдата VI Еўпатара**, які накіраваў у Таўрыку войска на чале з палкаводцам Дыяфантам. Аб'яднанымі сіламі (Херсанеса і Понта) Дыяфант разграміў скіфаў (110–107 гады да Нар. Хр.), але платай за дапамогу стала страта аўтаноміі – поліс трапіў пад пратэктарат Пантыйскага царства.

Пасля смерці Мітрыдата VI, зацятага ворага Рыма, Херсанес атрымаў статус "вольнага горада", улада ў якім належала невялікаму колу ўплывовых, вяльможных і багатых грамадзянаў, што арыентаваліся на Рым. У 60-х гадах I стагоддзя да Нар. Хр. для адбіцця новай небяспекі з боку скіфаў у Таўрыку былі накіраваныя рымскія легіёны. З гэтага часу Херсанес паступова ператвараецца ў фарпост рымскіх войскаў у Паўночным Прычарнамор'і. У яго цытадэлі, змяняючы і дапаўняючы адно аднаго, стаялі падраздзяленні I Італійскага,

---

* *Хора (грэц. χώρα – месца, зямля) – тэрыторыя, якая выкарыстоўвалася грамадзянамі антычнага поліса для заняткаў сельскай гаспадаркай. З'яўлялася структурнай часткай большасці антычных полісаў.*

** *Дынаст Пантыйскага царства, размешчанага ў Малой Азіі; скончыў жыццё самагубствам (63 год да Нар. Хр.) пасля атрымання весткі пра здраду сына Фарнака II, якога ён зрабіў уладаром Баспорскага царства. Рымляне абвясцілі Фарнака "сябрам і хаўруснікам рымскага народа".*

XI Клаўдзевага і V Македонскага легіёнаў, а ў гавані базаваліся караблі рымскага флоту; у горадзе была і стаўка ваеннага трыбуна, які камандаваў сухаземнымі і марскімі сіламі ў Крыме.

Размяшчэнне рэгулярных вайсковых фармаванняў, якія забяспечвалі абарону ад неспакойных паўночных суседзяў, барацьба рымскага флоту з пірацтвам спрыялі росквіту Херсанеса ў першыя стагоддзі нашай эры. У гэты час рамантавалі і ўмацоўвалі гарадскія сцены, будавалі новыя храмы, тэрмы (лазні), правялі некалькі нітак водаправода. Перыядычна ў горадзе чаканілі манеты. Да традыцыйных імпартаваных тавараў дадаўся бронзавы і шкляны посуд; узнікла і свая вытворчасць вырабаў са шкла; гарадскія майстры рабілі рознай формы судзіны, пакрытыя чырвоным лакам; на мясцовы рынак паступалі вострыя прыправы і духмяныя рэчывы. Маштабнага развіцця дасягнуў рыбазасольны промысел: пад час раскопак выяўлена больш за сто рыбазасольных цыстэрнаў, у некаторых з іх можна было прыгатаваць да 30—40 тонаў вострага соўсу — гарону.

Барацьба за ўладу, якая разгарэлася ў Рымскай імперыі ў III стагоддзі па Нараджэнні Хрыстовым, стала прычынай вываду з Крыма рымскіх легіёнаў, а з IV стагоддзя пад сценамі Херсанеса перыядычна з'яўляліся варвары (гуны, готы, пазней хазары, полаўцы і печанегі). Аднак магутны абарончы мур ратаваў горад, які стаў часткай Візантыйскай імперыі і называўся ад гэтага часу Херсонам. Выдатны візантыніст XX стагоддзя Дз. Абаленскі называў яго "перлінай у кароне Візантыйскай імперыі". Пачынаючы з эпохі Канстанціна I* пачало мяняцца і аблічча горада: з'явіліся хрысціянскія храмы**. Аж да XIII стагоддзя горад быў фарпостам Візантыі ў Крыме, знаходзячыся на скрыжаванні вайскова-палітычных інтарэсаў Хазарскага каганата, Кіеўскай Русі, печанегаў і полаўцаў.

---

* *Канстанцін Вялікі (272—337 гады па Нар. Хр.) — імператар з 306 года; у 313 годзе разам з сваім хаўруснікам Ліцыніюсам выдаў Міланскі эдыкт, які абвясціў роўнасць хрысціянскай веры (нароўні з паганствам).*

** *Яшчэ ў I стагоддзі ў Херсанесе з'явіліся высланыя сюды паслядоўнікі новай веры, якія пакутавалі ад смагі і голаду ў каменяломнях; тут завяршыліся мукі Клімента I, чацвёртага рымскага папы.*

І ўсё ж ён заставаўся ўскраінным для Візантыі месцам, дзе адбывалі высылку непажаданыя царкоўныя герархі і зрынутыя з пасады імператары. У сярэдзіне VII стагоддзя сюды быў адпраўлены папа Марцін, а ў канцы гэтага стагоддзя – пазбаўлены кароны імператар Юстыніян II. Потым, пасля вяртання на трон, ён выслаў у Херсон вяльможнага армяніна Вардана, які пад імем Філіпіка запанаваў тут пазней пры падтрымцы херсанесцаў і хазараў, праўда ненадоўга.

Раскопкі паказалі, што для Херсанеса, як і для некаторых іншых антычных цэнтраў, характэрна прастакутная сетка падоўжных і папярочных вулічных магістраляў (Гіпадамава* планіроўка). У антычную эпоху ў яго цэнтральнай частцы размяшчалася галоўная плошча з грамадскімі і сакральнымі будынкамі, непадалёк ад порта знаходзіўся рынак, а на схіле пагорка – тэатр.

Херсанескі тэатр, пабудаваны на мяжы IV і III стагоддзяў да Нар. Хр., змяшчаў каля 3000 гледачоў (усіх грамадзян). У перыяд рымскага панавання яго арэна выкарыстоўвалася для гладыятарскіх баёў. Калі хрысціянства стала афіцыйнай рэлігіяй Рымскай імперыі, тэатралізаваныя пастаноўкі сталі несумяшчальнымі з новай ідэалогіяй. З часам тэатр заняпаў, і на яго руінах былі пабудаваныя два хрысціянскія храмы. Адзін, размешчаны над архестрай, быў разабраны ў часе рэстаўрацыйных работ XX стагоддзя; другі – вялікі крыжападобны храм – адкрыты К. Касцюшкам-Валюжынічам. Гэтая старажытная пабудова захавалася і атрымала назоў "храм з ківотам", бо ў ім быў знойдзены рэліквар з мошчамі. Херсанескі тэатр (адкрыты ў 1956 годзе) – адзінае з вядомых у наш час збудаванне такога тыпу антычных гарадоў Паўночнага Прычарнамор'я.

Як сведчаць агіяграфічныя** крыніцы, у I стагоддзі Херсанес наведаў апостал Андрэй, а пазней, у 60-х гадах

---

** Гіпадам (паміж 485 і 405 гадамі да Нар. Хр.) – архітэктар з Мілета, якому прыпісваецца стварэнне сістэмы новай (рэгулярнай) планіроўкі з сеткай вуліц, якія перасякаюцца пад простым кутом. У Мілеце яна была выкарыстаная ў 479 годзе да Нар. Хр. пад час аднаўлення горада, разбуранага персамі ў 494 годзе да Нар. Хр.*

*** Агіяграфія (грэц. ἅγιος – святы і γράφω – пішу) – жыццяпіс святых.*

IX стагоддзя, па дарозе ў хазарскія землі – стваральнікі славянскага пісьменства, салунскія браты Кірыла і Мяфод.

У канцы X стагоддзя каля сцен Херсона-Корсуня з'явілася дружына князя Уладзіміра, якому пасля шматмесячнай аблогі гараджане, што пакутавалі ад нястачы вады, самі адчынілі браму. Тут Уладзімір прыняў хрост. У адным з палацаў горада ён чакаў прыбыцця з Канстанцінопаля пасольства з прынцэсай Ганнай, рука якой была яму абяцаная імператарам Васілём II за дапамогу ў задушэнні бунту прэтэндэнтаў на трон. Пасля хросту і шлюбных цырымоній Уладзімір пакінуў Херсон, вывез у якасці "здабычы" абразы і святароў – трэба было хрысціць Русь. На памяць пра падзеі канца X стагоддзя на галоўнай плошчы Херсанеса, меркаваным месцы хрышчэння князя Уладзіміра, у 1861 годзе быў закладзены Свята-Уладзімірскі сабор, а раней на тэрыторыі гарадзішча заснаваны манастыр. І заканамерна, што, асвятляючы раскопкі К. Касцюшкі-Валюжыніча, журналісты канца XIX стагоддзя пісалі: "Стамільённы народ стане з часам шукаць тут калыску праваслаўнай веры, працавітыя археолагі стануць старанна здабываць з руінаў спустошанага горада рэчы далёкай мінуўшчыны, нямыя сведчанні той хрысціянскай даўніны, таго хрысціянскага ладу, які так урачыста быў перанесены адсюль".

Пад час Чацвёртага крыжовага паходу (1204) крыжакі захапілі Канстанцінопаль. Імперыя распалася на шэраг дзяржаў. Сярод іх найбольш значнымі сталі Нікейскае і Трапезундскае царствы ў малаазійскіх межах былой дзяржавы; з апошнім да 1261 года – да аднаўлення Візантыі – Херсон меў шчыльныя сувязі. У першай палове XIII стагоддзя свет стэпавых вандроўнікаў прыйшоў у рух, стварыўшы пагрозу народам Усходняй Еўропы. У студзені 1223 года ў Крыме, каля сцен Судака, з'явіліся татары; у тым самым годзе былі абрабаваныя судны, на якіх везлі падаткі з Херсона і гарадоў Крыма ў Трапезунд.

Дараванне імператарамі Візантыі гандлёвых прывілеяў італійскім купцам, генуэзска-венецыянскія супярэчнасці ў Чорным моры, перамяшчэнне галоўных гандлёвых шляхоў ва ўсходнюю частку Таўрыкі, дзе генуэзцамі былі заснаваныя гандлёвыя факторыі (Кафа-Феа-

досія, Салдая-Судак), а па суседстве з Херсонам узвысілася Чамбала (Балаклава), — усё гэта мела негатыўныя наступствы для эканомікі Херсона.

У 1299 годзе паўднёвую і паўднёва-заходнюю Таўрыку спустошыла арда хана Нагая. Не змог выстаяць і Херсон. Праз сто гадоў яму быў нанесены чарговы ўдар: у 1399 годзе цемнік Едыгей аддаў Херсон агню і мячу. Пасля гэтага ўзняцца гораду не было наканавана. У першай палове XV стагоддзя яшчэ тлела жыццё ў невялікім рыбацкім пасёлку, але неўзабаве насельнікі пакінулі і яго, і толькі на італійскіх мапах месца некалі славутага горада пазначалася як зручная карабельная стаянка.

У XVI стагоддзі пасол вялікага князя Сцяпана Батуры ў Залатую Арду Марцін Бранеўскі (?–1593), які паходзіў з беларускай шляхты, пісаў пра Херсанес: "Вартыя подзіву разваліны яскрава сведчаць, што некалі гэта быў цудоўны, багаты і слаўны горад грэкаў, шматлюдны і славуты сваёй гаванню. На ўсю шырыню паўвострава, ад берага да берага, яшчэ і цяпер узвышаецца высокі мур і шматлікія вежы з вялізных часаных камянёў. Гэты горад стаіць пусты, незаселены і ўяўляе сабой адны руіны і спусташэнне. Дамы абернутыя ў нівеч і зраўнаваныя з зямлёй..."

Марцін Бранеўскі быў адным з апошніх еўрапейцаў, якія наведалі Херсанес, — гэта адбылося ў 1579 годзе. На доўгі час прыбярэжная тэрыторыя, разам з Херсанесам, увайшла ў склад Крымскага ханства і была зачыненая для хрысціян. Толькі пасля Расейска-турэцкай вайны канца XVIII стагоддзя стала магчымым бачыць руіны Херсанеса і пачалося іх вывучэнне.

У Херсанесе няма настолькі велічных і сусветна вядомых помнікаў, як у Афінах або Рыме. Для навукоўцаў-візантыністаў значэнне Херсанеса ў тым, што горад існаваў бесперапынна ў антычны і сярэднявечны перыяды, што дазваляе прасачыць асаблівасці яго развіцця з VI стагоддзя да Нар. Хр. і ажно да XIV стагоддзя. Акрамя таго, у Новы час вялікая частка гарадзішча засталася вольнай ад забудовы, што дае археолагам магчымасць адкрываць тут цэлыя кварталы і нават гарадскія раёны.

# ПАЧАТАК ВЫВУЧЭННЯ КРЫМА

*Крым адкрыўся для вывучэння * Камяні мёртвага горада * Будуючы Севастопаль, знішчалі Херсанес * Усведамленне значэння старажытных помнікаў * Месца хрышчэння князя Уладзіміра * "Тут капаў, хто хацеў..."*

Таўрыка, Таўрыда, Крым – невялікая трапецападобная частка сушы, што выступае ў мора, якая стала месцам сустрэч і суіснавання розных этнасаў. Па стэпавых абшарах тут няраз праходзілі орды варвараў, у гарах жылі таўры, памяць пра якіх захаваў ранні назоў паўвострава. З цягам часу на землях Крыма ўзнікла Скіфскае царства, ва Усходнім Крыме – Баспорскае, і існавала дэмакратычная рэспубліка Херсанес Таўрыцкі. Пазней Херсанес (Корсунь) згадваўся ў летапісах у сувязі з візантыйска-ўсходнеславянскімі дамовамі і паходам князя Уладзіміра, які пахрысціў Русь. З канца XV стагоддзя землі Таўрыкі ўваходзілі ў склад Крымскага ханства.

Пасля заканчэння Расейска-турэцкай вайны (1768–1774) у адной з балгарскіх вёсак было падпісанае пагадненне, якое ўвайшло ў гісторыю пад яе назовам – Кючук-Кайнарджыйскі мір. Артыкулы гэтай дамовы замацоўвалі выхад Расеі на абшары Чорнага мора: яно стала адкрытым для расейскіх караблёў. З гэтага часу ўзбярэжжа, дзе размяшчаўся і старажытны Херсанес, стала аб'ектам цікавасці расейскіх і заходнееўрапейскіх гісторыкаў.

Пасля падпісання мірнай дамовы на месцы невялікай вёскі Ахціяр, недалёка ад Херсанеса, пачалося стварэнне Севастопаля. Фаварыт імператрыцы Кацярыны II, генерал-фельдмаршал Рыгор Пацёмкін (1739–1791), дарэчы, з паходжання ліцьвін-беларус, за заслугі ва ўладкаванні новых земляў атрымаў тытул князя Таўрыцкага.

У першыя гады будаўніцтва Севастопаля мёртвы горад выкарыстоўвалі як крыніцу матэрыялаў. Гістарыёграф Адміральскай калегіі, акадэмік П.-С. Палас (1741–1811) пісаў, што "пры заняцці Крыма існавала

яшчэ вялікая частка муру, пабудаванага з адмысловых часаных камянёў, выдатная гарадская брама і значная частка моцных вежаў, з якіх адна стаяла над самай бухтай і яшчэ пры маім наведванні ў 1794 годзе знаходзілася ў прыстойным стане. Але пабудова Севастопаля стала прычынай знішчэння гэтага старажытнага горада".

Севастопаль з часу ўзвядзення першых вайсковых пабудоваў пачатку XIX стагоддзя, безумоўна, вельмі змяніўся. Да канца XIX стагоддзя горад быў адноўлены пасля разбурэнняў, выкліканых Крымскай вайной. У дні знаходжання там Касцюшкі па праекце акадэмікаў архітэктуры К. Тона і А. Аўдзеева ў цэнтры горада пабудавалі Уладзімірскі сабор (1881–1888). Існаваў у горадзе і Марскі музей, у якім да пабудовы Сховішча старажытнасцяў К. Касцюшка-Валюжыніч прапаноўваў размясціць археалагічную экспазіцыю.

У другой палове XVIII стагоддзя з'явілася ўсведамленне гістарычнага значэння помнікаў Паўночнага Прычарнамор'я, імкненне сабраць і захаваць наяўныя звесткі пра іх. У 1782 годзе быў складзены "Акуратны план палажэння Ахціярскай гавані з старажытнымі гарадамі Ахціярам і Херсонам, якія ляжаць пры ёй"; пазней, на загад Р. Пацёмкіна, быў зроблены "План старажытнага Херсона", а праз некаторы час – "План руінаў старажытнага Херсона" (1786).

Да канца XIX стагоддзя адносіцца стварэнне археалагічнага музея ў Феадосіі, распачатае на сродкі знакамітага мастака-марыніста Івана Айвазоўскага. Феадосія з'явілася на карце Таўрыкі ў VI стагоддзі да Нар. Хр.; у 1270-х гадах генуэзцы заснавалі тут гандлёвую факторыю Кафу. Руіны фартэцы XIV–XV стагоддзяў дайшлі да нашых дзён.

У 1821 годзе ў Крым былі накіраваныя акадэмік Генрых Карл Эрнст Кёлер і архітэктар Эжэн Паскаль. Па вяртанні яны падалі ўраду запіску, у якой пералічваліся помнікі, "вартыя захавання і вывучэння". У 1827 годзе з ініцыятывы галоўнага каменданта партоў Чорнага мора віцэ-адмірала А. Грэйга* былі распачатыя археалагічныя

* *Аляксей Грэйг (1775–1845; з паходжання шатландзец) – галоўны камандзір Чарнаморскага флоту і партоў; віцэ-адмірал (1816–1833); пра яго гл.: Крючков Ю. С. Алексей Самуилович Грейг. М., 1984.*

даследаванні херсанескага гарадзішча. Мэтаю раскопак з'яўлялася вызначэнне месца, дзе быў ахрышчаны князь Уладзімір. У 1829 годзе А. Грэйг пісаў обер-пракурору св. Сінода, што па абавязку службы часта бывае ў Херсанесе, успамінае св. Уладзіміра, але са шкадаваннем бачыць, што “месца, якое было сведкам эпахальных падзей і іх бліскучым помнікам, застаючыся без усялякага нагляду, няспынна знішчаецца і што з часам яно і зусім можа знікнуць, так што нават зацікаўлены не знойдзе і прыкмет існавання некалі знакамітага горада”.

Надалей раскопкі праводзіліся пад эгідай Адэскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў, а ў сапраўднасці – манахамі мясцовага манастыра. Кантролю за раскопкамі фактычна не было. Аднак варта адзначыць, што ў настаяцеля манастыра архімандрыта Яўгена атрымалася стварыць невялікі музей, частка знаходак з якога была адпраўлена на Політэхнічную выставу ў Маскву, дзе і згубілася.

Даследаванні, якія праводзіліся пад кантролем Адэскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў, не набылі сістэматычнага характару. Праўда, былі выяўлены каштоўныя эпіграфічныя помнікі, некалькі хрысціянскіх храмаў. Пра той час старшыня археалагічнай камісіі А. Бобрынскі* пісаў: “Тут капаў, хто хацеў; захады ж, зробленыя дзеля захавання Херсанеса, – арганізацыя багадзельні, пераўтворанай у манастыр, афіцыйныя раскопкі Адэскага таварыства – не далі карысці, бо не было строга вызначанага плана; справу вялі асобы, якія не маюць ні дастатковых ведаў (манахі), ні сродкаў (таварыства)”.

Безумоўна, Адэскае таварыства гісторыі і старажытнасцяў, якое кантралявала раскопкі да 1888 года, імкнулася спрыяць захаванню помнікаў, пра што сведчаць шматлікія звароты да кіраўніцтва манастыра, які знаходзіўся на тэрыторыі гарадзішча; яно выдавала інструкцыі, спрабавала знайсці кіраўніка раскопак, але становішча не паляпшалася.

Вось адзін з дакументаў, які адлюстроўвае “дзейнасць” Адэскага таварыства па захаванні помнікаў Херсанеса: “Таварыства перакананае ў тым, што Ваша

---

* *Аляксей Бобрынскі (1852–1927) – сенатар; член Дзяржаўнага савета; у 1918 годзе эміграваў у Заходнюю Еўропу.*

Правялебнасць не адмовіць у спрыянні мэтам, накіраваным на карысць Паўднёвага краю Расеі, і мае гонар звярнуцца да Вас з пакорнаю просьбай.

У межах даручанай Вам паствы знаходзяцца многія гістарычныя гарады і паселішчы, да гэтага часу больш-менш вядомыя. Тут увесь час выпадкова сустракаюцца старажытныя манеты, рэчы, камяні з надпісамі, посуд, пісьмовыя дакументы. Было б карысна для навукі, калі б пра такія знаходкі паведамлялі Таварыству, а яно, з свайго боку, тлумачыла і апісвала іх, а пра самыя цікавыя друкавала нататкі. Мясцовае духавенства, як асвечаны клас сярод таўрыцкага народанасельніцтва, у такіх выпадках можа вельмі памагчы.

Херсанеская мясцовасць, дзе цяпер стаіць манастыр, заслугоўвае археалагічнага даследавання больш за астатнія. Для гісторыі краю і археалогіі каштоўная кожная зробленая тут знаходка; таму вельмі пажадана, каб мясцовае начальства, ажыццяўляючы будаўніцтва, звярнула асаблівую ўвагу на выяўленне старажытных прадметаў, г. зн. манет, судзінаў, надпісаў і г. д., а таксама на паступовае складанне планаў адкрытых старажытных фундаментаў, што для будаўнічага камітэта цалкам магчыма.

Таварыства было б вельмі ўдзячнае, калі б херсанескія знаходкі засяроджваліся ў Адэскім музеі як цэнтральным у краі, і такім чынам запаўняліся б прагалы. У Херсанесе таксама трапляюцца прадметы, якія належаць да паганскай эпохі; Таварыства мяркуе, што херсанескі манастыр — не месца для захоўвання такіх знаходак"*.

Старшыня Маскоўскага археалагічнага таварыства графіня П. Уварава**, наведаўшы Херсанес з удзельнікамі археалагічнага з'езда, пісала ў 1884 годзе віцэ-прэзідэнту Адэскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў

---

* *Са звароту да Епіскапа Таўрыцкага і Сімферопальскага Гурыя. 30.04.1868 (Архіў Нацыянальнага запаведніка "Херсанес Таўрыцкі", справа 37, аркуш 4).*

** *Праскоўя Уварава (1840—1924) — ганаровы сябар Імператарскай Акадэміі навук (1895); жонка вядомага археолага А. Уварава (1825—1884), які ў 1853 годзе даследаваў адну з базілік Херсанеса, што носіць ягонае імя ("Увараўская базіліка"); пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі эмігравала ў Сербію.*

У. Юргевічу*: "На вялікі жаль, заўважыла, што айцец Пахом – поўны гаспадар даследавання руінаў горада. Між тым Вы, як віцэ-прэзідэнт таго таварыства, якое ўзначальвае гэтую навуковую працу і пад адказнасць якога праводзіліся раскопкі, не маеце ў гэтай чыста навуковай справе ўлады, неабходнай для ратавання руін Херсанеса ад канчатковай іх гібелі. Ніхто з навукоўцаў, якія наведалі Херсанес, не мог зразумець, чаму справай, якую завочна вядзе Адэскае таварыства, загадвае асоба, зусім не вядомая навуцы".

Толькі з 1888 года, калі на раскопкі ў Херсанес быў запрошаны К. Касцюшка-Валюжыніч, даследаванні пачалі набываць сістэматычны характар.

* *Уладзіслаў Юргевіч (1818–1898) – археолаг і філолаг; выкладаў у Харкаўскім універсітэце, тамсама абараніў магістарскую дысертацыю, а доктарскую – у Адэсе; з 1889 года – сябар Маскоўскага археалагічнага таварыства; віцэ-прэзідэнт (1883) Адэскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў; з 1858 года працаваў у Рышэльёўскім ліцэі (з 1865 года – Наварасійскі ўніверсітэт).*

# «НЕ ХАВАЮ СВАЁЙ ЛІЦЬВІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦІ...»

*Шляхоцкі род Қасцюшкаў * Дзе нарадзіўся Кароль? * Архітэктурныя "сведкі" падзеяў * На абодвух берагах Дзвіны * Знакаміты зямляк * Любоў да Радзімы не ведае межаў * Хатняя адукацыя * Першы крок да Горнага інстытута * Скончыць вучобу не давялося*

Першы загадчык херсанескіх раскопак Кароль Қасцюшка-Валюжыніч нарадзіўся 2 траўня (20 красавіка ст. ст.) 1847 года ў родавым маёнтку Новае Сяло Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобласці) у шляхоцкай сям'і. Род Қасцюшкаў прызнаны Магілёўскім дваранскім дэпутацкім сходам (9 студзеня 1850 года, № 325), з унясеннем у 6-ю частку дваранскай радаводнай кнігі. Род улічваецца з 1809 года.

У некралозе, надрукаваным у 1908 годзе, адзначана, што Қасцюшка-Валюжыніч нарадзіўся ў Магілёве, "у старажытнай польскай радавітай сям'і"*. Аднак пра нацыянальную прыналежнасць К. Қасцюшкі-Валюжыніча захаваліся ягоныя ўласныя словы. У 1899 годзе старшыня археалагічнай камісіі, як гаворыцца ў дакументах, "быў ашчасліўлены" асабістым прыёмам імператара. На копіі запісу размовы, насланай К. Қасцюшку-Валюжынічу, пасля слоў А. Бобрынскага «Қосцюшко-Валюжинич, через "С" и "Ц", Ваше Величество, а не Қостюшко. Он особенно настаивает не смешивать эти две фамилии...» пазначана

* *Магілёў як месца нараджэння нашага суайчынніка падаецца ў некаторых літаратурных крыніцах. Гэта, як і сцверджанне, што ён нарадзіўся "ў старажытнай польскай радавітай сям'і", не адпавядае рэчаіснасці. Қароль нарадзіўся ў беларускай шляхоцкай сям'і.*

“Таму што не хаваю сваёй ліцьвінскай нацыянальнасці і рымска-каталіцкага веравызнання. К. Касцюшка-Валюжыніч”.

Бацькоўскі маёнтак Новае Сяло размяшчаўся на правым беразе Дзвіны пры вусці рэчкі Росіца, паблізу сённяшняй беларуска-латвійскай мяжы, побач з сялом Друя. Маёнтак гэты, відаць, быў спраўным — у спісах землеўласнікаў Новага Сяла на пачатак XX стагоддзя значыцца каталік Фёдар Казіміравіч Касцюшка-Валюжыніч з 220 дзесяцінамі зямлі; можна меркаваць, што Фёдар быў родным братам Караля Казіміравіча.

Хутчэй за ўсё, Касцюшкі-Валюжынічы бралі хрост у Прыдруйску (цяпер Піедруя ў Латвіі, насупраць пасёлка Друя сучаснага Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці). Невялікі, але прыгожы касцёл у Піедруі добра захаваўся, дзейнічае і сёння. А вось лёс больш велічнага Траецкага касцёла ў Друі, пабудаванага ў 1643–1646 гадах, драматычны. У гады Другой сусветнай вайны была знішчаная ўся верхняя частка званіцы, а пасля вайны гэтая бажніца была аддадзеная пад склад мінеральных угнаенняў, якія вельмі пашкодзілі яе падлогу. У апошнія гады касцёл быў рэстаўраваны і перададзены вернікам. Такім чынам, у Друі захаваліся “сведкі” ўсіх гістарычных падзеяў апошніх трох з паловай стагоддзяў — касцёл Святой Тройцы і кляштар бернардынцаў. Касцёл “бачыў” войны і з расейцамі, і са шведамі, і з французамі, і з немцамі. Гэты комплекс лічыцца першым сакральным хрысціянскім каменным збудаваннем на ўсёй Браслаўшчыне.

У пачатку XVII стагоддзя Друя была буйным гандлёва-рамесным цэнтрам, а дзякуючы замку — яшчэ і магутным абаронча пунктам на Дзвіне. У сярэдзіне XVII стагоддзя ў Друі існавала больш за 300 дымоў і каля 100 корчмаў; жылі тут амаль 2000 чалавек: ганчары, ліцейнікі, злотнікі, шаўцы, рымары, кавалі, ткачы, краўцы, цесляры, сталяры, мечнікі, муляры ды іншыя рамеснікі. Былі і музыкі, і скамарохі, і “багамазы”.

З сярэдзіны XIX стагоддзя, калі ў Новым Сяле жылі бацькі Караля, па святах жыхары маёнтка наведвалі Траецкі касцёл з арганам, куды сцякалася насельніцтва з усіх навакольных сёлаў і нават з Латгаліі: Прыдруйск і Друю праз Дзвіну злучаў паром.

Друя, дзе прайшлі дзіцячыя гады нашага героя, размешчаная на паўночным усходзе Браслаўскага раёна на левым беразе Дзвіны пры ўпадзенні ў яе рэчкі Друйкі. Цяпер у Друі паўтары тысячы жыхароў; у сярэдзіне ж XIX стагоддзя, калі нарадзіўся Кароль Касцюшка-Валюжыніч, іх было больш за паўчварты тысячы, а ў 1904 годзе – нават 5472 жыхары, сярод іх 3468 юдэяў, 853 каталікі, 616 праваслаўных і 535 старавераў.

Упершыню Друя згадваецца ў "Хроніцы" Мацея Стрыйкоўскага пад 1386 годам у складзе беларускай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага. У гэты ж час князь Андрэй Полацкі выступіў супраць Крэўскай вуніі (1385) і "Полацак, Дрысу, Друю і немалую частку Русі з дапамогай крыжакоў апанаваў". У верасні 1579 года ў Друі спыняўся вялікі князь Сцяпан Батура, які вяртаўся з войскам з-пад Пскова. У XVI стагоддзі тут было створана рукапіснае Друйскае евангелле – адзін з шэдэўраў беларускай рукапіснай кнігі. У 1618 годзе Друя атрымала магдэбургскае права і герб: віціна з разгорнутым ветразем на сярэбраных хвалях у блакітным полі.

Найбольш старажытная частка Друі размяшчалася ў вусці Друйкі. Тут у 1701 годзе прыпыняўся цар Пётр І. У XVIII стагоддзі праз Друю праходзіў гандлёвы шлях з Расеі ў Рыгу і Каралявец*. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) Прыдруйск увайшоў у склад Расеі, а ў Друі размяшчаліся памежныя войскі Рэчы Паспалітай. З канца XVIII стагоддзя тут праходзіў паштовы тракт Пецярбург–Вена. Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай (1793) Друя ўвайшла ў склад Расейскай імперыі. У 1904 годзе тут было 359 дамоў, 52 крамы, прыстань, 3 гарбарні, 275 рамеснікаў. Штогод праводзілася восем кірмашоў. Дзейнічалі тры праваслаўныя царквы, касцёл і дзве сінагогі**.

Адносна ландшафту Друя займае выключнае становішча: узгорысты рэльеф, звілістая пойма Друйкі, шырокая і паўнаводная Дзвіна... Вежы храмаў Друі і Прыдруйска ствараюць адзіную архітэктурна-прасторавую кампазіцыю, аб'яднаную блакітнымі каралямі Дзвіны і зялёнымі масівамі берагоў.

---

* *Кёнігсберг, Прусія; цяпер Калінінград, Расея.*

** *Hedemann O. Dzisna i Druja: Magdeburskie miasta. Wilno, 1934.*

Самым трагічным для Друі стаў 1920 год – паводле Рыжскай дамовы (11.08.1920) да Латвіі цалкам адышлі тры паветы Віцебскай губерні: Дзвінскі, Рэжыцкі і Люцынскі, а ад Дрысенскага павета – цалкам Прыдруйская, амаль уся Пустынская і палова Сушкоўскай воласці, якія былі далучаныя да сучаснага Краслаўскага раёна Латвіі. Беларуска-латвійская мяжа пралягла не далей за адзін кіламетр ад Новага Сяла. І да верасня 1939 года Друя была ў складзе Польшчы. Цяпер Друя знаходзіцца ў памежнай зоне Рэспублікі Беларусь; уезд у гэтую зону грамадзяне Беларусі і яе рэзідэнты ажыццяўляюць пры ўмове папярэдняга тэлефанавання ў Дзяржаўны памежны камітэт.

У 1866 годзе каля Дрысы (сучасны Верхнядзвінск) была пракладзеная чыгунка Полацак–Дзвінск. Чыгуначная станцыя Дрыса з'яўлялася галоўным пунктам вывазу лёну за мяжу: праз яе штогод адпраўлялі да 240 тысяч пудоў ільноваланка; у 1905 годзе ў горадзе жыло каля шасці тысяч чалавек. Наведваў Кароль Касцюшка-Валюжыніч і Дзвінск (былы Дынабург), і Полацак, балазе праз ягоныя мясціны ў абодва бакі ішла чыгунка. У Полацку захапляўся старажытным Сафійскім саборам.

Такой была малая радзіма Караля Касцюшкі-Валюжыніча пры ягоным жыцці. Яшчэ да апошняй вайны ў Новым Сяле знаходзілася памежная застава. А цяпер гэтае некалі людное паселішча дажывае свой век; старажыхароў тут ужо няма. Пад шатамі лісцёвага лесу – былога прысядзібнага парку – сёння можна пабачыць, але ў вельмі запусцелым выглядзе, тое, што раней было панскай сядзібай, з сажалкай і невялікім азярцом сярод палявога раздолля. Дом, вядома, не захаваў першапачатковага выгляду: дах стаў шыферным, а раней быў гонтавым; але сцены, размяшчэнне пакояў, ваконныя і дзвярныя праходы, ганак і галоўная печ захавалі ранейшыя рысы.

Можна спадзявацца, што з часам родавы маёнтак Караля Касцюшкі-Валюжыніча будзе адноўлены, і ў ім размесціцца музей даследніка Херсанеса Таўрыцкага як філіял Браслаўскага краязнаўчага музея. Тады можна будзе чакаць сюды наплыву турыстаў з розных краін, бо і мясціны тут надзвычай прыгожыя: вольная даліна лагоднай Дзвіны з крутым правым берагам, па-

крытым лісцёвым лесам. Па ўсім відаць, што Кароль у маладыя свае гады любіў тут гуляць*.

Друя стала месцам нараджэння яшчэ аднаго знакамітага гісторыка. У апошняй чвэрці XIX стагоддзя тут з'явіўся на свет хлопчык, якому было наканавана стаць адным з найвыдатнейшых візантыністаў XX стагоддзя – Уладзімір Беняшэвіч (1874–1938).

Пасля заканчэння з залатым медалём Віленскай 1-й гімназіі (1893) Уладзімір Беняшэвіч атрымаў вышэйшую адукацыю на юрыдычным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта (1897) з дыпломам 1-й ступені і быў пакінуты ва ўніверсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. Згодна з традыцыяй тых часоў, яго накіравалі для ўдасканалення адукацыі ў Заходнюю Еўропу, дзе ён вывучаў старажытныя рукапісы ў бібліятэках і архівах, слухаў лекцыі ў Ляйпцыгскім, Берлінскім і Гайдэльбергскім універсітэтах Германіі**.

У. Беняшэвіч няраз наведваў Афон, Сінай і святыя месцы Палестыны, знаёміўся з помнікамі Егіпта, Грэцыі ды Малой Азіі, вывучаў рукапісы ў архівах Пецярбурга, Масквы, Вены, Берліна, Мюнхена, Парыжа, Венецыі, Рыма, Фларэнцыі, Неапаля, Афінаў. Пазней працаваў у бібліятэках на Блізкім Усходзе, у Стамбуле, у сховішчах рукапісаў Афона, Ерусаліма, Каіра і манастыроў вострава Патмас. Нястомны даследнік пільна перапраўляраў тэксты, ставячы перад сабой усё новыя пытанні і спрабуючы знайсці на іх адказы. Пад час паездак ён наведаў 49 бібліятэк! Вынікі ягоных навуковых пошукаў выліліся ў капітальныя працы, сярод якіх перш за ўсё варта назваць чатырохтамовае выданне "Нарысаў з гісторыі Візантыі" (СПб., 1912–1915).

Таленавіты вучоны даследаваў больш за 3000 рукапісаў, з іх каля тысячы апісаныя ім упершыню. Ягоныя магістарская і доктарская дысертацыі былі адзначаныя прэміямі Расейскай акадэміі навук (1905 і 1914 гады). Ён быў ганаровым сябрам Афінскага таварыства візантыністаў, сябрам Страсбургскай акадэміі

---

* *Бубала А. Ф. Вяртанне на Радзіму // Дзвінская праўда. 2006. № 89, 94, 98.*

** *Ермоленко В. А. Основоположник российского византиноведения // Гісторыя: праблемы выкладання. 2006. № 11. С. 51–52.*

навук, сябрам-карэспандэнтам Баварскай (Мюнхен) і Прускай (Берлін) акадэмій навук. У 1928 годзе рыхтаваўся да абрання ў акадэмікі АН СССР, але замест гэтага апынуўся ў высылцы (Кем, Салавецкія лагеры). Уладзіміра Беняшэвіча абвінавацілі ў контррэвалюцыйнай дзейнасці ў сувязі з "чысткай" у Акадэміі навук, пад час якой з 1790 (штатных і звышштатных) супрацоўнікаў былі звольненыя 648*. Праз пяць гадоў У. Беняшэвіча, дзякуючы хадайніцтву А. Эйнштэйна і Ф. Нансена, вызвалілі. Але ў 1937 годзе яго зноў арыштавалі і 27 студзеня 1938 года расстралялі разам з двума сынамі.

Мяркуючы па архіве К. Касцюшкі-Валюжыніча, з Уладзімірам Беняшэвічам ён не ліставаўся. Але цалкам магчыма, что пад час аднаго з наведванняў Друі даследнікі маглі сустрэцца – у горадзе з 4–5 тысячамі жыхароў многія ведалі адзін аднаго. Праўда, У. Беняшэвіч быў на 27 гадоў маладзейшы за земляка.

Дзед Караля браў удзел у драматычных падзеях 1794–1795 гадоў і знаходзіўся не ў апошніх шэрагах змагароў за свабоду пад кіраўніцтвам славутага Андрэя Тадэвуша Касцюшкі. Бацька ж ягоны, паводле некаторых звестак, быў таксама неабыякавы да пазнейшых падзей – паўстання 1863–1864 гадоў, накіраванага на адраджэнне Рэчы Паспалітай і аднаўленне свабоды беларускага народа.

Маці Караля звалі Лізаветай. Яна была адукаванай жанчынай і навучыла сына чытаць і пісаць з малых гадоў. Хлопчык з дзяцінства выдатна ведаў нямецкую мову, свабодна цытаваў Гайнрыха Гайнэ і Ёгана Вольфганга Гётэ; добра валодаў таксама французскай мовай.

Прапрадзед нашага героя Іван меў сына Івана, у якога быў сын Казімір Захар, які і ёсць бацькам Караля. Каралёвы браты былі старэйшыя за яго: Тодар – на 9 гадоў, Пётра – на 3 гады і Казімір – на год.

Атрымаўшы добрую хатнюю адукацыю пад наглядам маці, у жніўні 1859 года, ва ўзросце 12 гадоў, Кароль Касцюшка-Валюжыніч, сын тытулярнага саветні-

---

* *Пра гэта гл.: Перченок Ф. Ф. Академия наук на "великом переломе" // Звенья: Исторический альманах. М., 1991. Вып. 1. С. 208; Брачев В. С. "Дело" академика С. Ф. Платонова // Вопросы истории. 1989. № 5. С. 117–129.*

ка, паступіў на падрыхтоўчае аддзяленне (у ліку штатных выхаванцаў) Інстытута Корпуса горных інжынераў. У той час гэта была прэстыжная закрытая вайсковая навучальная ўстанова, якая славілася высокім роўнем адукацыі; у яе прымалі ў асноўным дзяцей небагатых дваран. Інстытут рыхтаваў геолагаў, шахтабудаўнікоў, горных электрамеханікаў, горных інжынераў і маркшэйдэраў. Пазней сталі рыхтаваць металургаў і нафтавікоў.

Магчыма, выбар месца навучання быў зроблены бацькам Караля, які бываў у сваіх сваякоў у Магілёве. А там кожнае лета праводзілі славутыя прафесары Пецярбургскага ўніверсітэта, браты родам з Амсціслава – геолаг Сцяпан Куторга (1805–1861) і гісторык-эліністМіхаіл Куторга (1809–1886). Старэйшы з іх, Сцяпан, заснаваў Расейскае мінералагічнае таварыства і сабраў вялікую калекцыю скамянеласцяў, якая склала аснову Палеанталагічнага аддзела музея пры Пецярбургскім універсітэце. Таксама ён быў бліскучым лектарам і таленавітым педагогам – студэнты сыходзіліся на ягоныя лекцыі з усіх факультэтаў. Самай важкай працай навукоўца стала 10-вярстовая геалагічная карта Пецярбургскай губерні (1852), адзначаная Дзямідаўскай прэміяй Пецярбургскай Акадэміі навук і Канстанцінаўскім медалём Расейскага геаграфічнага таварыства. Вялікі поспех мела і яго навукова-папулярная кніга “Гісторыя зямной кары”, якая спрыяла зацікаўленасці расейскай моладзі геалогіяй і горнай справай.

Санкт-Пецярбургскае Горнае вучылішча за свае заслугі перад сусветнай горнай навукай яшчэ тады лічылася найлепшай горнай школай у свеце. На другое месца ставілі Фрайбэргскую горную акадэмію, заснаваную ў Германіі ў 1765 годзе; вядомая таксама і Кракаўская горная акадэмія ў Польшчы, заснаваная ў 1919 годзе.

Інстытут Корпуса горных інжынераў у Пецярбурзе карыстаўся папулярнасцю сярод моладзі беларускіх губерняў, бо яго выпускнікі добра ўладкоўваліся ў жыцці і былі матэрыяльна забяспечанымі людзьмі. Многія з іх сталі знакамітымі горнымі інжынерамі з рэпутацыяй сусветнага маштабу. Згадаем, напрыклад, Караля (Карла) Багдановіча (1864–1947), шляхціча з Віцебскай губерні. Ён стаў вядомы ў сусветнай навуцы дзякуючы шырокамаштабным экспедыцыйным даследаванням геалогіі Цянь-Шаня, Паміра і высакагорнага Тыбета.

Няма сумневу, што і Кароль Касцюшка-Валюжыніч з часам стаў бы выдатным горным інжынерам. Для гэтага ў яго было ўсё – і здольнасці, і імкненне. Усе выхаванцы падрыхтоўчых курсаў Інстытута Корпуса горных інжынераў навучаліся па паскоранай праграме гімназій і пасля іх заканчэння аўтаматычна залічваліся на першы курс Інстытута. Здарылася, аднак, інакш. Каралю Касцюшку-Валюжынічу скончыць Горны інстытут не давялося. Магчыма, праз свае "касцюшкаўскія" ідэалы, а паводле іншых сведчанняў – як сваяк вядомага правадыра паўстання, Кароль 20 верасня 1865 года быў звольнены з пятага падрыхтоўчага класа і пакінуў сталіцу.

Менавіта тут дарэчы яшчэ раз нагадаць пра размову Мікалая II і графа А. Бобрынскага, калі апошні імкнуўся патлумачыць, што К. Касцюшка-Валюжыніч асабліва настойваў на напісанні прозвішча з "Ц", а не з "Т", каб ягонае імя не суадносілі з Тадэвушам Касцюшкам (па-расейску прозвішча кіраўніка паўстання 1794 года пісалася "Костюшко"). На іх родавыя сувязі паказвае артыкул у адным з першых апублікаваных у Расеі энцыклапедычных слоўнікаў – Бракгаўза і Эфрона, дзе гаворыцца: "Касцюшка (Kosciuszko) – шляхецкі род герба Рох; яшчэ ў сярэдзіне XVI стагоддзя падзяліўся на некалькі галін: Касцюшкаў-Валюжынічаў, Касцюшкаў-Хабалтоўскіх, Касцюшкаў-Сяхновіцкіх і проста Касцюшкаў. У канцы XVII і пачатку XVIII стагоддзя Уладзіслаў Касцюшка быў пінскім стольнікам. Ягоным унукам быў Андрэй Тадэвуш Касцюшка".

# ПАД ХЕРСАНЕСКАЙ ЗОРКАЙ

*Вяртанне дадому * Праца на чыгунцы * Першыя падарожжы * Пераезд у Крым * Залатое дно для гістарычнай навукі * Самаахвярная служба любімай справе * Шмат цікавых знаходак * "Два Херсанесы" * Таямніцы старажытных напластаванняў*

У 1865 годзе Кароль вярнуўся ў Новае Сяло і, як сказана ў аўтабіяграфіі, "працаваў на сельскай гаспадарцы ў бацькоўскім маёнтку". Праз тры гады, у 1868 годзе, ён паступіў на працу ва ўправу Дынабург-Віцебскай чыгункі на пасаду памачніка галоўнага інжынера "з прычыны добрага ведання нямецкай мовы".

Праца была звязаная з улікам матэрыяльных каштоўнасцяў. Касцюшку-Валюжынічу даводзілася наведваць Каўказ і Урал, Сярэднюю Азію і Сібір – грузы з таварных цягнікоў часам прападалі, і ён часта выязджаў на неабсяжныя прасторы Расеі па судовых справах. У 1879 годзе Кароль паехаў у Севастопаль лячыцца ад хваробы лёгкіх. Там пачаў працаваць ва ўправе Лазова-Севастопальскай чыгункі (спачатку на пасадзе канторшчыка, а пасля – старшага бухгалтара-рахункавода). Паўтара дзясятка гадоў (1867–1881) працаваў на розных участках Расейскай чыгункі. Гады ў сырым Пецярбурзе, праца на чыгунцы, няспынныя пераезды драматычна адбіліся на ягоным здароўі: увосень 1881 года ён пакінуў службу з уласнага жадання, а ў 1882-м перанёс цяжкую аперацыю: з прычыны абсцэсу яму было выдалена лёгкае. Лекары рэкамендавалі назаўжды пасяліцца ў Крыме. І ён, як пісаў у аўтабіяграфіі, "валодаючы некаторай маёмасцю", набыў дом у Севастопалі, дзе і пражыў да свайго скону.

Максім Горкі калісьці сказаў: "Крым для гістарычнай навукі – залатое дно. Гэта натуральна – у ім квітнелі такія раскошныя кветкі элінскай культуры,

як Херсанес, Пантыкапея". Нядзіўна, што старажытнасці Крыма прыцягнулі ўвагу К. Касцюшкі-Валюжыніча. Цяжка сказаць, калі дакладна ў нашага земляка ўзнікла цікавасць да гісторыі, але ўжо ў 1882 годзе ён заснаваў Гурток аматараў гісторыі і старажытнасцяў Крыма з музеем і бібліятэкай. Галоўнымі задачамі гуртка абвяшчалася "ахова ад спусташэння, раскрадання і продажу за мяжу мясцовых старажытнасцяў".

У студзені 1885 года К. Касцюшку-Валюжыніча абралі таварышам (намеснікам) дырэктара Севастопальскага гарадскога банка (ён заставаўся на гэтай пасадзе да 1890 года). А ў 1888 годзе, паводле рэкамендацыі віцэ-прэзідэнта Адэскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў У. Юргевіча, яго запрасілі да вядзення работ у Херсанесе. Да 1891 года ён сумяшчаў службу ў банку і неаплатныя заняткі археалогіяй. Раскопкі набывалі ўсё больш шырокі маштаб, і Касцюшка быў вымушаны звярнуцца да А. Бобрынскага з просьбай аб фінансаванні гэтых работ: "Паспяховае вядзенне археалагічных раскопак у Херсанесе абумоўлена галоўным чынам маёй нязменнай прысутнасцю на месцы працы. Да 1 студзеня гэтага года я служыў па выбарах кіраўніцтва Севастопальскага гарадскога банка з забеспячэннем 1200 руб. на год і мог, вядома, наведваць херсанескія раскопкі толькі ў вольны час. Не шукаць далейшай службы мне не дазваляюць матэрыяльныя сродкі, але, любячы занятак археалогіяй і ўсведамляючы, што магу быць карысны для справы, даручанай мне Камісіяй, я мушу прапанаваць наступнае — ці не будзе мэтазгодным прызначыць мяне загадчыкам раскопак з забеспячэннем 1200 руб. на год". Просьба К. Касцюшкі-Валюжыніча цалкам вытлумачальная, калі ўлічваць, што ён быў галавой вялікай сям'і: меў трох сыноў (Пётра, Павел і Зьміцер) і чатырох дачок (Лізавета, Любоў, Марыя і Аксеня)*.

---

* *Пётра (нар. 1874) — штурман далёкага плавання; Лізавета (нар. 1876) — жонка капітана Касовіча; Павел (нар. 1877) — паручнік флоту; Любоў (нар. 1879) — жонка паручніка В. Рота, які стаў памачнікам К. Касцюшкі-Валюжыніча; Марыя (нар. 1881); Зьміцер (нар. 1884) — штурман далёкага плавання; Аксеня (нар. 1890).*

Захопленасць гісторыяй Крыма абумовіла "навуковыя экскурсіі" Касцюшкі: ён наведаў помнікі Чарнаморскага ўзбярэжжа ад Севастопаля да Керчы*. Прафесійная цікавасць, а таксама неабходнасць пошуку работнікаў не аднойчы прыводзілі К. Касцюшку-Валюжыніча ў Керч, дзе ў старажытнасці знаходзілася сталіца Баспорскага царства — Пантыкапей (стар.-грэц. *Παντικάπαιον* — рыбны шлях). Першапачаткова невялікі горад, заснаваны ў канцы VII стагоддзя да Нар. Хр. выхадцамі з Мілета на ўзбярэжжы Малой Азіі, ён ад 480 года да Нар. Хр. пачаў ператварацца ў буйны палітычны і эканамічны цэнтр. У эпоху Вялікага перасялення народаў Баспорскае царства знікла з карты Таўрыкі. Праўда, на тэрыторыі былога Пантыкапея, які зваўся ў першым тысячагоддзі Баспорам, існавала невялікае паселішча. Цяпер руіны антычнага горада можна бачыць на гары Мітрыдат. Да яе вяршыні вядзе Вялікая Мітрыдатава лесвіца з 423 прыступак, збудаваная ў 1833–1840 гадах. Свой назоў гара атрымала на імя пантыйскага цара Мітрыдата VI Еўпатара.

У ваколіцах Керчы размешчаныя знакамітыя скіфскія курганы і руіны невялікіх гарадоў-спадарожнікаў сталіцы Баспорскага царства — Мірмекія, Цірытакі, Німфея. Ад I стагоддзя па Нар. Хр. дайшоў склеп з дзівоснай фрэскай, якая паказвае выкраданне Аідам Персефоны ("Склеп Дэметры"): поўным трагізму поглядам праводзіць Дэметра калясніцу, што забірае дачку.

Да пазнейшага часу адносіцца цытадэль Ені-Кале (1703). Безумоўна, пералічыць усе помнікі Усходняга Крыма немагчыма, аднак варта адзначыць, што напярэдадні прызначэння на раскопкі ў Херсанес К. Касцюшка-Валюжыніч збіраўся пераехаць у Керч, пра што сведчыць ягоны зварот у Імператарскую археалагічную

---

* *Зразумела, Касцюшку былі вядомыя адкрыцці іншых навукоўцаў, напрыклад працы гісторыка, археолага, этнографа Арсеня Маркевіча (1855–1942), які паходзіў з Берасця і ў 1918 годзе знаходзіўся ля вытокаў стварэння Сімферопальскага ўніверсітэта. Да пазнейшага часу адносіцца дзейнасць Глеба Бонч-Асмалоўскага (1890–1943), які паходзіў са шляхты Ігуменскага павета і якому належыць адкрыццё ў Крыме стаянкі выкапнёвага чалавека (неандэртальца) у пячоры Кіік-Коба (1923–1924).*

камісію з просьбай прызначыць яго на вакантнае месца дырэктара Керчанскага музея: “З’яўляючыся загадчыкам Музея старажытнасцяў, я змагу прыносіць карысць прадмету, горача мною любімаму”, — пісаў ён А. Бобрынскаму.

На шчасце для Херсанеса, яму было адмоўлена. Калі ў 1888 годзе даследаванне Херсанеса Таўрыцкага перайшло ў распараджэнне камісіі, Касцюшка стаў памачнікам выдатнага расейскага візантыніста Н. Кандакова*, кіраўніка раскопак да 1891 года. З гэтага часу да канца зямных дзён Касцюшка-Валюжыніч самааддана служыў любімай справе. За ўсю гісторыю вывучэння гарадзішча ніхто не адкрыў гэтулькі помнікаў, не пакінуў пасля сябе такога велізарнага ліставання і дасканалай, з пазіцый таго часу, дакументацыі, як К. Касцюшка-Валюжыніч.

Менавіта становішча спраў у Херсанесе і выклікала зварот графіні П. Уваравай да Аляксандра III, што стала штуршком да пачатку сістэматычных раскопак пад кантролем археалагічнай камісіі. Яе старшыня, А. Бобрынскі, у 1887 годзе ў рапарце ў Міністэрства імператарскага двара адзначыў, што ў Херсанесе ў адрозненне ад Пампеі цяжка чакаць вялікіх і хуткіх вынікаў: “Там захавалася ўсё, тут — толькі падмуркі, бо Херсанес няраз зазнаваў разбурэнні ад розных плямёнаў, якія не шкадавалі помнікаў мастацтва, часта не пакідалі каменя на камені. Але можна аднавіць падмуркі, адкрыць новыя помнікі старажытнага побыту, пахаваныя пад зямлёй. Неабходны даследаванні не толькі тэрыторыі ў межах абарончага муру, але і наваколля горада, дзе на падставе знаходак манет магчыма выяўленне слядоў старажытнага, давізан-

* *Нікадзім Кандакоў (1844–1925) — візантыніст і гісторык мастацтва; правадзейны сябар Акадэміі мастацтваў і Пецярбургскай акадэміі навук; прафесар Наварасійскага (Адэса, 1877–1888, 1919), Пецярбургскага (1888–1897), Сафійскага (1920–1922), Карлавага (Прага, 1922–1925) універсітэтаў, старшы захавальнік Аддзялення Сярэдніх вякоў і эпохі Адраджэння ў Эрмітажы, сябар Імператарскай археалагічнай камісіі, Маскоўскага археалагічнага таварыства. У 1919–1920 гадах быў памачнікам рэдактара газеты Добраахвотніцкай арміі “Южное слово”. У 1920 годзе эміграваў. Стварыў у Празе школу візантыназнаўства.*

тыйскага Херсанеса* і дзе зусім не было ніякіх навуковых раскопак".

Пісаў А. Бобрынскі і пра неабходнасць стварэння ў Херсанесе музея.

Такім чынам, запрошанаму загадчыкам раскопак Каралю Касцюшку-Валюжынічу трэба было прывесці тэрыторыю гарадзішча ў парадак, арганізаваць сістэматычнае даследаванне помнікаў, а ў перспектыве – стварыць музей непасрэдна ў Херсанесе.

Першыя два гады, як пісаў ён пазней, пераследавалася адна мэта: сабраць як мага больш цікавых знаходак, каб паказаць значэнне раскопак, бо ён лічыў, што археалагічная камісія "прызнае нязручным рабіць штогадовы буйны грашовы выдатак, калі раскопкі не прывядуць да добрых вынікаў". І сапраўды, ужо ў першы год работ, у 1888 годзе, атрымалася выявіць майстэрню па вытворчасці тэракотавых фігур (з мадэлямі), шматлікія фрагменты антычнага посуду, манету III стагоддзя да Нар. Хр. – сведчанні ранняга існавання Херсанеса на беразе Каранціннай бухты. І хоць гэта былі яшчэ не самыя старажытныя знаходкі, яны выклікалі сумнеў у сведчанні старажытнагрэцкага географа і гісторыка Страбона**, які пісаў пра два Херсанесы. Але Касцюшку-Валюжынічу яшчэ трэба было даказаць, што Херсанес, які ён адкрываў, бесперапынна існаваў на адным месцы з часу заснавання.

Страбон у "Геаграфічных запісках" апісаў узбярэжжа, дзе існавала, паводле ягонай думкі, два Херсанесы: "Пры выхадзе з заліва з левага боку ляжыць маленькі гарадок і яшчэ адзін заліў херсанесцаў. Калі плыць

* *Да раскопак К. Касцюшкі-Валюжыніча лічылася, што на беразе Каранціннай бухты існавалі два Херсанесы – Старажытны і Новы.*

** *Страбон (каля 63 года да Нар. Хр. – каля 20 года па Нар. Хр.) – славуты грэцкі географ і гісторык; нарадзіўся на поўначы Малой Азіі ў пантыйскім горадзе Амасіі ў вяльможнай грэцка-пантыйскай сям'і; шмат падарожнічаў; быў у Рыме і Італіі; наведаў у 24 годзе да Нар. Хр. Егіпет. "Геаграфічныя запіскі" ў 17 кнігах, напісаныя ў сталым узросце, захаваліся фактычна цалкам. "Геаграфія" змяшчае шматлікія звесткі пра розныя раёны Еўропы, Азіі, Афрыкі; яны цікавыя назіраннямі аўтара і выкарыстаннем сведчанняў даўнейшых прац. Ранейшая праца "Гістарычныя запіскі" да нашага часу не дайшла.*

далей уздоўж берага, відаць вялікі мыс, які выступае ў мора на поўдзень і складае частку цэлага Херсанеса (маецца на ўвазе паўвострава. – *Аўт.*). На гэтым мысе размешчаны горад гераклейцаў, які таксама называецца Херсанесам, адлеглы, калі плыць уздоўж берагоў, на 4400 стадыяў* ад Ціраса. Паміж горадам і мысам тры гавані. Далей знаходзіцца Старажытны Херсанес, які ляжыць у руінах, і потым гавань з вузкім уваходам, дзе таўры звычайна збіралі свае разбойніцкія банды (Балаклава. – *Аўт.*), нападаючы на тых, хто ратаваўся ўцёкамі. Гэтая гавань называецца Сімбалон Лімен і ўтварае разам з другой гаванню пад назовам Ктэнунт перашыек на 40 стадыяў. Гэты перашыек, які замыкае Малы Херсанес, складае, як я сказаў, частку Вялікага Херсанеса, з аднайменным паўвостраву горадам Херсанесам"**.

Гэтае апісанне і выклікала дыскусію пра "два Херсанесы" – за позні гісторыкі прымалі менавіта той, што размяшчаўся паміж Каранціннай і Пясочнай бухтамі і дзе Касцюшка з 1888 года праводзіў раскопкі.

У 1889 годзе, паведамляючы ў археалагічную камісію пра адкрыццё вялікага хрысціянскага храма з рэшткамі цудоўнай мазаічнай падлогі, даследнік падкрэсліў: "Раскопкі выяўляюць рэшткі двух паселішчаў, адно над другім з розным размяшчэннем знаходак. Унізе, на глыбіні 5 аршынаў, сустракаецца мноства амфарных ручак з імёнамі грэцкіх вяльможаў, лямпачак (маюцца на ўвазе гліняныя свяцільні. – *Аўт.*) з рэльефнымі мастацкімі выявамі, абломкаў выдатнага грэцкага посуду з малюнкамі, арнаментамі ды імёнамі майстроў; вышэй ідуць манеты рымскіх імператараў, грубы гліняны посуд з палівай, херсанескія манеты візантыйскай эпохі і іншыя прадметы хрысціянскага перыяду, усе пашкоджаныя агнём".

У 1890 годзе ён зноў адзначыў: "Раскопкі на беразе мора, паміж морам і манастырскім садам, выявілі плошчу з старажытным напластаваннем, без якіх-небудзь збудаванняў, а на ёй – вуліцу візантыйскага Херсона

---

* *Стадый – мера даўжыні, якая роўная 177,6 метра (атычны), 192,3 метра (алімпійскі).*

** *Страбон. VII, 4,2.*



“Рох III” – родавы герб Касцюшкаў



Друя (злева) і Прыдруйск (удалечыні справа)
на акварэлі Напалеона Орды. 70-я гады XIX стагоддзя



Траецкі касцёл у Друі.
Здымак зроблены перад Першай сусветнай вайной




Інстытут Корпуса горных інжынераў,
які К. Касцюшку-Валюжынічу не давялося скончыць



Працуючы болей за дзесяць гадоў ва ўправе
Дынабург-Віцебскай чыгункі, Кароль Касцюшка-Валюжыніч
аб'ездзіў па абавязку службы паў-Расеі



Кароль Касцюшка-Валюжыніч у чаркесцы.
1885–1887 гады



Аляксей Бобрынскі,
старшыня Імператарскай
археалагічнай камісіі



Праскоўя Уварава,
старшыня Маскоўскага
археалагічнага таварыства




"Пралом" у абарончым муры ў партовым раёне для праезду
да Сховішча старажытнасцяў. Здымак канца XIX стагоддзя




Касцюшка-Валюжыніч каля Сховішча мясцовых старажытнасцяў. Пачатак XX стагоддзя



Кароль Касцюшка-Валюжыніч суправаджае імператара Мікалая II з імператрыцай на экскурсіі па руінах Херсанеса. 1902 год



81

Стѣна съ калиткой не связана съ башней, подобно стѣ-
нѣ съ лѣвой стороны, но только вплотную пристроена
къ ней и рѣзко отличается отъ первой и отъ башни
характеромъ кладки, которая состоитъ изъ узкихъ
плитъ, не украшенныхъ рустами, но пригнанныхъ весь-
ма старательно. Судя по найденнымъ здѣсь монетамъ
и многочисленнымъ амфорнымъ ручкамъ съ именными пе-
чатями астиномовъ, стѣна съ калиткой сооружена
въ концѣ III или въ началѣ II в. до Р. Х.
Это 3й периодъ разростанія города въ греческую авто-
номную эпоху, послѣ котораго начинается упадокъ города (1)
Пристроенная стѣна до угла излома и калитка въ ней
ясно видны на прилагаемомъ фотогр. снимкѣ № 34.
Надъ этой калиткой, въ римскую эпоху, когда грече-
ская стѣна, а слѣдовательно и калитка и круглая баш-
ня слабы, были, по невыясненной причинѣ, искусственно
засыпаны на всей ихъ высотѣ, — явилась новая калитка
1.70 м. шириной, отъ которой сохранился лишь нижній
рядъ кладки. (См. фотогр. снимокъ № 35.) Здѣсь,
слѣдовательно, повторяется то же, что было обнаруже-
но въ 1899 г. на смежномъ лѣвомъ участкѣ стѣны:
надъ заложенными и засыпанными въ римскую эпоху воро-
тами выстроилась калитка, въ которой сохранился
еще на своемъ мѣстѣ мраморный порогъ и камни отъ
свода которой лежали тутъ же.
Стѣна надъ сводомъ калитки, послѣ ея засыпки, про-
бита въ двухъ мѣстахъ для пропуска въ городъ гон-
чарной трубы водопровода и выше водоотводнаго
канала, обнаруженныхъ на всемъ протяженіи раскопокъ
1899 г. и показанныхъ на планѣ подъ лит. „Ж" и „Е".
Цѣльныхъ гончарныхъ трубъ не найдено, но между плитами,
перекрывавшими цилиндровый водоотводный каналъ,
оказались двѣ надгробныя: известковая древнегреческой
эпохи безъ надписи, изображенная на фотогр. снимкѣ № 39,
и мраморная, вынутая изъ постамента той же эпохи,
съ изображеніемъ стоящаго мужчины и съ греческой надписью
римскаго периода, эстампажъ и фотографич. снимокъ съ
которой помѣщены подъ № 180-мъ, при описаніи находокъ.

(1) Въ наступленіи римской эпохи, на что указываютъ грубо исполненныя мѣстныя монеты съ типами древнѣйшаго периода и промежуточныя между стѣны, между которыми древнегреческой кладкой и римской верхней, выдѣляющаяся по своей небрежной кладкѣ.

Старонка справаздачы Караля Касцюшкі-Валюжыніча
пра вынікі раскопак




Агульны план херсанескіх раскопак паводле Д. Айналава (Памяті




...ики христианского Херсонеса. Вып. 1: Развалины храмов. М., 1905)



Антычная брама IV стагоддзя да Нар. Хр., адкрытая К. Касцюшкам-Валюжынічам у 1899 годзе. Верхні ярус – сцены IX стагоддзя. Сучасны здымак



Адкрыты К. Касцюшкам-Валюжынічам у 1897 годзе “храм зківотам”, у якім быў знойдзены сярэбраны рэліквар VI стагоддзя з мошчамі. Сучасны здымак



“Базіліка ў базіліцы”. Атрымала такі назоў ад таго, што пазнейшы храм (Х стагоддзя) пабудаваны тут на руінах даўнейшага (VI стагоддзя). Даследаванні комплексу пачаліся ў 1889 годзе. У 2007 годзе дзве малыя калоны і частка мазаічнай падлогі былі разбураныя вандаламі. Здымак 2004 года



Рэшткі заходняй часткі абарончага муру Херсанеса. Гарадская тэрыторыя каля яго даследавалася К. Касцюшкам-Валюжынічам у 1891, 1892, 1895 і 1901 гадах. Сучасны здымак



Так званая вежа Зянона – ключавы элемент фартыфікацыі Херсанеса. Атрымала назоў на імя візантыйскага імператара, які ў 488 годзе фундаваў умацаванне гарадскіх сцен, пра што сведчыць знойдзены на вежы надпіс. Сучасны здымак



Экспанаты ў Сховішчы старажытнасцяў



Крыжападобны храм ("храм з ківотам"), пабудаваны на месцы антычнага амфітэатра. Сучасны аэрафотаздымак



Кароль Касцюшка-Валюжыніч у працоўным кабінеце.
Здымак пачатку XX стагоддзя



На карціне мастака У. Васкрасенскага – рэканструкцыя сцэны прыняцця прысягі ў старажытным Херсанесе



Бадай, самая сенсацыйная эпіграфічная знаходка Караля Касцюшкі-Валюжыніча – стэла з Прысягай херсанесцаў




Фрагмент мармуровай калоны з раскопак Херсанеса
як помнік на магіле Караля Касцюшкі-Валюжыніча

і разбураную капліцу з трыма магільнымі скляпамі. У ніжнім напластаванні вельмі шмат знаходак, выключна дахрысціянскага часу, з іх галоўныя – мноства амфарных ручак з імёнамі астыномаў*, манаграмамі вытворцаў і рознымі выявамі". Акрамя таго, былі выяўлены яшчэ адна капліца і вуліцы, а "да самай скалы ішоў суцэльны пласт рэштак бітага посуду, як грубага, так і лакаванага, тэракотавых вырабаў і клеймаваных амфарных ручак". Так пачалі з'яўляцца матэрыялы, якія дазвалялі меркаваць пра час адкладання найбольш ранняга пласта: знойдзена надмагілле з грэцкім надпісам IV стагоддзя да Нар. Хр.

---

* *Астыном – службовая асоба гарадской выканаўчай улады ў Старажытнай Грэцыі.*

# АДКРЫЦЦЮ СПАДАРОЖНІЧАЕ ТАЛЕНТ

*Першыя вынікі раскопак* ✻ *Бліскучыя адкрыцці* ✻ *Даследаванне некропаля* ✻ *Страбон памыляўся* ✻ *Няспынная канфрантацыя з манастыром* ✻ *Як бараніцца ад Вайсковага ведамства?* ✻ *Даследаванне абарончага муру* ✻ *"Раскопкі, багатыя навуковымі сюрпрызамі..."* ✻ *Навука пра чарапкі*

Пра першыя вынікі раскопак К. Касцюшка-Валюжыніч паведаміў у 1891 годзе пад час лекцыі, прачытанай у Севастопальскім марскім сходзе. Знаёмячы слухачоў з імі, ён перш за ўсё адзначыў магчымасці археалагічных даследаванняў у цэлым: "Задача археалогіі – знаёміць нас з жыццём старажытных народаў, у самым шырокім сэнсе гэтага слова. Калі прызнаць за ёю гэтае права, то лёгка пераканацца, наколькі ганаровае месца павінна належаць ёй пры вывучэнні тутэйшага краю і асабліва грэцкіх калоній. Тых калоній, якімі ў часы глыбокай старажытнасці было ўсеяна Чарнаморскае ўзбярэжжа, што ўваходзіць цяпер у склад Расейскай імперыі. Наколькі мізэрнымі былі б, напрыклад, нашыя веды пра Баспорскае царства, калі б яны абмяжоўваліся звесткамі, што дайшлі да нас ад старажытных пісьменнікаў; пра іншыя грэцкія калоніі нашага ўзбярэжжа мы ведалі б яшчэ меней! Менавіта таму выяўленыя матэрыялы дапамогуць вырашыць спрэчкі паміж гісторыкамі".

Да ліку найбольш значных і перспектыўных задач даследнік аднёс: вызначэнне месца старажытнага Херсанеса і храма багіні Дзевы; выяўленне сцен, згаданых Страбонам, якія ахоўвалі Малы Херсанес (у той час меркавалі, што яны былі размешчаныя паміж Балаклавай і Інкерманам). Што да першага пункта, дык ён паведаміў: "Невялікія раскопкі 1890 года і тапаграфія мясцовасці паказалі, што ранні Херсанес мог быць толькі на

невялікім паўвостраве ў вышнявіне Казачай бухты. Ці доўга існаваў? Ці быў шматлюдным? Адказы адмоўныя. У III стагоддзі да Нар. Хр. Херсанес знаходзіўся ўжо там, дзе мы яго бачым у цяперашні час".

Спыніў ён увагу слухачоў і на помніках візантыйскага часу: "Што да хрысціянскіх храмаў, то іх, разам з капліцамі, адкрыта да цяперашняга часу дваццаць і нямала яшчэ будзе адкрыта ў будучыні, – але ўсе яны маюць сляды моцнага разбурэння і пазнейшай грубай перабудовы з ужываннем для падмуркаў і сцен мармуровых базаў, капітэляў і кавалкаў калон, якія засталіся ад першапачатковых храмаў.

Усе херсанескія храмы мелі форму базілік. Яны выяўляюцца разбуранымі і перабудаванымі, прычым мармуровыя часткі, якія не пасуюць адна да адной ні стылем, ні велічынёю, несумненна, сабраныя з розных месцаў горада. Праз гэта немагчыма археалагічным шляхам вызначыць час пабудовы першых хрысціянскіх храмаў у Херсанесе, з руінаў якіх, ужо значна пазней, пабудаваны тыя, што былі адкрытыя раскопкамі".

У 1891 годзе пачалося даследаванне некропаля. Пазней Касцюшка, паведамляючы севастопальскаму горададнаначальніку, падкрэсліваў, што раскопкі прывялі да бліскучых вынікаў у выглядзе шматлікіх каштоўных артэфактаў, а на падставе знойдзеных тут эпіграфічных помнікаў і манет можна зрабіць выснову, што некропаль праіснаваў ад IV стагоддзя да Нар. Хр. і да VI стагоддзя па Нар. Хр. Пра гэтыя адкрыцці ў "Крымскім весніку" паведамлялася: "Найноўшыя раскопкі, што праводзяцца Касцюшкам, вывелі на святло помнікі, якія сведчаць пра аўтаномны Херсанес, пра старажытны грэцкі Херсанес. Цяпер сп. Касцюшка на падставе пяцігадовых выведак лічыць магчымым прызнаць меркаванне Страбона пра існаванне двух Херсанесаў неабгрунтаваным".

Так, з дапамогай раскопак Касцюшкі-Валюжыніча на месцы нібыта "Новага Херсанеса" быў адкрыты горад, жыхары якога валодалі шырокай тэрыторыяй, размешчанай на Гераклейскім паўвостраве, а "Стары Херсанес" каля Казачай бухты ўяўляў сабой не больш чым руіны сельскіх сядзібаў грамадзян.

У ходзе дыскусіі, на вынік якой у значнай меры паўплывалі археалагічныя даследаванні 1888–1891 гадоў, было даказана, што Херсанес ад самага пачатку існаваў

на тым самым месцы, што і ў рымскім і візантыйскім перыядах.

Іншым дыскусійным пытаннем тых гадоў стала перыядызацыя фартыфікацыйнага будаўніцтва. Пачатак сістэматычнага апісання раскапаных участкаў фартыфікацыйнай агароджы быў пакладзены А. Бэрцье-Дэлягардам, які вялікую ўвагу аддаваў тапаграфіі мясцовасці.

У 1893–1894 гадах Касцюшка адкрыў фрагмент старажытнага абарончага муру ў паўднёва-заходнім куце гарадзішча. Імкнучыся працягнуць раскопкі, ён звярнуўся з афіцыйным лістом да настаяцеля манастыра архімандрыта Аляксандра, у якім гаварылася, што мур "паказвае ранейшыя абрысы Каранціннай бухты і вызначае плошчу, якую займаў старажытны горад"; і з тае прычыны, што ён "паварочвае на захад у кірунку манастырскага вінаградніку", Кароль Казіміравіч просіць дазволу даследаваць дадзены ўчастак муру ў поўным аб'ёме.

Гэты факт можа падацца нязначным, але варта памятаць пра тое, што на тэрыторыі гарадзішча быў сад, існаваў двор для жывёлы і паша. Гэта не толькі замінала планамерным раскопкам, але і забруджвала як раскапаныя, так і яшчэ не вывучаныя ўчасткі горада. І, вядома, спрычынялася да канфрантацыі з манастыром.

Варта памятаць і тое, што манастыр быў праваслаўным, а Касцюшка вызнаваў каталіцтва, пра што яму раз-пораз нагадвалі. Так, пад час аднаго з канфліктаў яго абвінавацілі ў "іншавер'і", а праз гэта і ў непаважлівым стаўленні да праваслаўных святыняў Херсанеса. Адказваючы на закіды, Касцюшка-Валюжыніч заўважыў, што базілікальныя храмы, якія ён раскопвае, пабудаваныя ў ранневізантыйскі час; яны аднолькава шануюцца і цэняцца і праваслаўнымі, і каталікамі, бо падзел цэркваў адбыўся пазней, у 1054 годзе*.

Старшыня археалагічнай камісіі А. Бобрынскі імкнуўся падтрымліваць Касцюшку, таму ў адным з ягоных лістоў да кіраўніцтва манастыра была звернутая ўвага на тое, што "брація не мусіць выконваць ролю экскурсаводаў; манастыру нельга вывозіць на раскопкі адкіды і пасвіць жывёлу на тэрыторыі гарадзішча". Га-

---

* *Падрабязна гэты сюжэт разгледжаны (з вытрымкамі з архіўных дакументаў) у кнізе: Романчук А. И. Возрождение античного города: Очерк истории изучения Херсонеса. Свердловск, 1991.*

варылася пра неабходнасць перадачы ўсіх знойдзеных да 1888 года артэфактаў загадчыку раскопак (меліся на ўвазе царкоўныя старажытнасці з музея манастыра).

Кароль Касцюшка-Валюжыніч усведамляў, што стварэнне манастыра на тэрыторыі старажытнага горада было магчыма ў той час, калі пра яго значэнне і веліч яшчэ не ведалі. Але ён разумеў і тое, што, калі Херсанес ператварыўся ў славуты еўрапейскі цэнтр, скасаваць манастыр стала немагчыма. І ўсё ж спадзяваўся, што "яшчэ ўсё можа змяніцца да лепшага, калі толькі манастыр будзе існаваць для Херсанеса, а не Херсанес для манастыра". І, бядуючы пра разбурэнні, якія чыніліся ў Херсанесе, пісаў 1 траўня 1904 года ў археалагічную камісію: "Чаму я не нарадзіўся на стагоддзе раней, я б схіліўся да ног імператрыцы і выратаваў бы Херсанес ад яго будучых ворагаў, якія прычынялі яму, пачынаючы з Крымскай кампаніі, і прычыняюць цяпер болей шкоды, чым гэта рабілі скіфы ды іншыя варвары"*.

Увага грамадскасці да Херсанеса не паляпшала стасункі з манастыром. Адзін з канфліктаў, які час ад часу разгараўся, быў выкліканы імкненнем К. Касцюшкі-Валюжыніча даследаваць помнікі побач з Уладзімірскім саборам. Тут ранейшымі раскопкамі Адэскага таварыства (да 1888 года) было выяўлена некалькі храмаў, не вывучаных цалкам. Адзін з іх намерыўся даследаваць Касцюшка. Аднак работнікаў, якіх ён паставіў для раскопак, манастырскае кіраўніцтва выгнала. Больш за тое, гэта прывяло да калектыўнай скаргі манастыра на загадчыка раскопак у археалагічную камісію. Бронячыся, ён пісаў: «Базілікі, размешчаныя з паўднёвага боку новага храма, ніколі і нікім не даследаваліся. Спадзеючыся знайсці якія-небудзь сведчанні пра час пабудовы гэтых старажытных храмаў, я паставіў работнікаў перакапаць алтарныя часткі названых базілік, дзе няма ні каменнай, ні мармуровай падлогі. Базілікі гэтыя захаваліся толькі дзякуючы майму пра тое хадайніцтву. Наколькі дарагія манастыру "помнікі старажытнай святыні", даказвае ўзвядзенне ў 1889 годзе на месцы капліцы з фрэскавым роспісам... гаспадарчай пабудовы».

---

* *Архіў Нацыянальнага запаведніка "Херсанес Таўрыцкі", справа 41, аркуш 55.*

Каб скласці ўяўленне пра ўмовы, якія суправаджалі дзейнасць К. Касцюшкі-Валюжыніча, варта звярнуцца да слоў з іншага ліста ў Пецярбург: "Пасля забрукоўвання плошчы вакол новага сабора рэшткі гэтыя (руіны базілік. — *Аўт.*) уяўляюць упадзіны, у якія скідаецца смецце. Настаяцель кажа, што яны перашкаджаюць хрэснаму ходу".

Ён адзначаў, што "распланаванне вакол сабора — сад, сцяна, дом з паўночнага боку, выкананне работ, неабходных для добраўпарадкавання, — прывядзе да знішчэння рэштак старажытных будынкаў"*.

У адным з праектаў добраўпарадкавання горада К. Касцюшка-Валюжыніч нагадваў, што землі пад манастыром і храмам св. Уладзіміра складаюць 112 дзесяцін. "І ўся гэтая тэрыторыя — цэнтр старажытнага горада — з'яўляецца археалагічнай скарбніцай, не кранутай даследаваннямі і часткова не даступнай для раскопак".

На захад за манастыром, на беразе мора размяшчаліся збудаванні Вайсковага ведамства: доўгай лініяй выцягнуліся батарэі і парахавыя скляпы. У антычны час тут знаходзіўся некропаль, таму пры будоўлі батарэй сустракаліся надмагільныя пліты, залатыя і сярэбраныя ўпрыгажэнні, манеты, посуд для духмяных рэчываў.

К. Касцюшка-Валюжыніч, паведамляючы пра дзейнасць Вайсковага ведамства, бедаваў, што "пры будаўніцтве парахавога склепа работнікі знаходзяць шмат старажытных манет ды іншых дробных прадметаў, з якіх, аднак, да гэтага часу мне не перададзена нічога, дарма што я своечасова звяртаўся з просьбай да начальніка інжынернай дыстанцыі і ягоных памочнікоў перадаваць мне ўсе знаходкі, а таксама паведамляць пра выяўленыя рэшткі старажытных збудаванняў. Цяпер я даведаўся з пэўнай крыніцы, што ў тых работнікаў старажытныя манеты купляюць паручнік Кавалёў і мясцовы таемны гандляр старажытнасцямі Буркоў. Таму я палічыў сваім абавязкам давесці пра гэта камісіі, пакорліва просячы прыняць належныя меры, каб мясцовыя чыноўнікі Вайскова-інжынернага ведамства звярталі на ўсё гэта ўвагу, як тое практыкавала-

---

* *Архіў Нацыянальнага запаведніка "Херсанес Таўрыцкі", справа 40, аркуш 22.*

ся раней, калі генерал-маёр Бэрцье-Дэлягард, кіруючы будоўляй батарэі, паспяваў у той самы час не толькі зберагаць для навукі ўсе знаходкі, але і складаць планы выяўленых пабудоваў.

Пры гэтым не магу не звярнуць увагу на тыя абставіны, што нагляд за аховай адкрытых старажытных збудаванняў стаўся немагчымым ад таго часу, як манастыр з усімі сваімі пабудовамі аддзяліўся ад раскопак высокай сцяной і пачаў замыкаць браму, што вядзе да гарадзішча. У выніку херсанескія раскопкі з іх адкрытымі храмамі, капліцамі ды іншымі будынкамі руйнуюцца і забруджваюцца манастырскім статкам, работнікамі і ніжнімі чынамі размешчаных тут вайсковых часцін. З увагі на ўмовы, у якіх знаходзіцца Херсанес, а таксама ўлічваючы штогадовае наведванне гарадзішча тысячамі турыстаў, такі стан рэчаў недапушчальны".

Спадзеючыся развязаць гэтую сітуацыю, ён пісаў 24 кастрычніка 1906 года А. Бобрынскаму: "Са страхам і надзеяй уручаю лёс шматпакутнага Херсанеса – рускага Корсуня – Вашай Міласці, і толькі Ваша гарачая любоў да Радзімы і дваццацігадовая праца на карысць Херсанеса даюць мне абсалютную ўпэўненасць у тым, што з боку Вашай Міласці будуць ужытыя ўсе захады для выратавання Херсанеса, што Вы пераканаеце Вайсковае ведамства ахвяравацца некаторымі выгодамі, якія зусім не маюць дзяржаўнага значэння, у інтарэсах забеспячэння за Херсанесам далейшых правоў раскопак, якія маюць сусветнае значэнне"*.

У 1895 годзе Касцюшка-Валюжыніч распачаў планамернае вывучэнне абарончага муру ў партовым раёне. Фартыфікацыйную агароджу Херсанеса да апошніх дзён жыцця ён лічыў адным з самых важных аб'ектаў даследаванняў. Гэтыя раскопкі працягваліся з перапынкамі да 1905 года і адкрылі значны ўчастак фартыфікацыі старажытнага горада. Як і вывучэнне цэнтральнай часткі гарадзішча, яны прынеслі звесткі, на падставе якіх стала магчымым скласці ўяўленне пра тапаграфію антычнага Херсанеса: "Раскопкі ў паўднёва-ўсходнім куце плошчы, перад храмам (саборам св. Уладзіміра. – *Аўт.*),

---

* *Архіў Нацыянальнага запаведніка "Херсанес Таўрыцкі", справа 41, аркуш 125.*

адбываліся плантажным спосабам. Ніжэй за ровень візантыйскага горада выяўленыя рэшткі старажытных пабудоваў з вялікіх пліт, абчасаных з абодвух бакоў і шчыльна прыгнаных без вапны. Характар муравання сцен і знойдзеныя тут чарапкі тонкага чарналакавага посуду высокай якасці даказваюць старажытнае паходжанне гэтых пабудоваў, а калі ўзяць пад увагу, што ўсе яны складаюць паўднёвую частку галоўнай вуліцы, то можна з пэўнасцю сказаць, што гэтая шырокая і прыгожая вуліца дасталася візантыйскаму гораду ў спадчыну ад старажытнагрэцкага Херсанеса і праходзіла праз яго акропаль. Тут павінны знаходзіцца найлепшыя храмы і помнікі; некаторыя з іх пад час раскопак знойдзеныя закінутымі паблізу, а менавіта — стэла з грамадзянскай Прысягай, псефізма* ў гонар Дыяфанта і Арыстона, п'едэстал ад статуі Афіны".

У 1901 годзе "Маскоўскія ведамасці" напісалі: "Раскопкі ў Херсанесе багатыя навуковымі сюрпрызамі, г. зн. такімі знаходкамі і адкрыццямі, якія адразу падважваюць цэлыя навуковыя тэорыі або адкрываюць зусім нечаканы погляд на старажытную гісторыю горада". І гэта не перабольшванне.

Найбольш выніковымі сталі раскопкі 1899—1900 гадоў, якія дазволілі адкрыць старажытную браму, выявіць скляпы з залатымі і сярэбранымі ўпрыгажэннямі, якія прыцягнулі ўсеагульную ўвагу на выставе ў Санкт-Пецярбурзе.

Пад час вывучэння ў 1899 годзе абарончага муру ў партовым раёне каля яго былі выяўленыя напластаванні грэцкага, рымскага перыядаў і пазнейшага часу, а таксама прысценнае надмагілле. Знойдзеныя эпіграфічныя помнікі сведчылі пра будаўнічыя працы, распачатыя на загад розных імператараў; да прыкладу, каля ўваходу ў горад знойдзены надпіс з імёнамі імператараў Феадосія і Аркадзія (канец IV стагоддзя н. э.). Пра даследаванні на гэтым участку Касцюшка-Валюжынiч пісаў: "Паводле таго значэння, якое ён меў у старажытныя часы, гэта найбольш цікавы пункт раскопак гарадзішча. Ён служыў для абароны старажытнага горада

---

* *Псефізма (стар.-грэц. ψήφισμα — рашэнне) — пастанова народнага сходу ў прыватным пытанні, у адрозненне ад закона, абавязковага для ўсіх грамадзян.*

на працягу двух тысячагоддзяў, і для такой ролі ён адпаведна прыстасаваны. Раскопкі даюць адказ, дзе знаходзіўся старажытны Херсанес, што важна для вывучэння тапаграфіі і геаграфіі горада". І даследнік зрабіў выснову: "Першыя выхадцы з Гераклеі, якія занялі пад горад невялікую палосу ўзбярэжжа з часткай выдатнай бухты, не маглі, вядома, адразу ж распачаць будоўлю такога манументальнага, адзінага ў сваім родзе муру. Старажытны Херсанес, безумоўна, у гэты час быў абнесены простай сцяной, ад якой яшчэ захаваліся нязначныя рэшткі з боку мора, дзе не палічылі патрэбным замяніць яе больш трывалай каменнай з яе ідэальнай муроўкай".

У перыбале*, каля антычнай брамы, К. Касцюшка-Валюжыніч адкрыў склеп, у плане Т-падобнай формы, з невялікімі нішамі. Ён лічыў, што склеп прызначаўся сцена- або горадабудаўніку, таму што быў збудаваны адначасова з мурам. Ля ўваходу ў склеп знайшлі залаты пярсцёнак. Унутры стаяла шэсць бронзавых і пакрытых чорным лакам пасудзін-урнаў з прахам, закрытых алавянымі вечкамі. На адной з бронзавых судзінаў — гідрыі**, выкарыстанай у якасці пахавальнай урны, — захаваўся надпіс: "Прыз ад Анакій". Хутчэй за ўсё, яна была ўзнагародай грамадзяніну Херсанеса за перамогу ў спаборніцтве ў гонар Дыяскураў (сыноў Зеўса). Паступова з вільготнай зямлі, якая запаўняла урны, разам з крэмаванымі парэшткамі былі дастаныя залатыя пласцінкі з выявай Пана і ліста аканту, ажурныя залатыя каралі з пласцінкай, а на ёй — выява Генія, які грае на ліры, надзіва тонкай працы завушніца з падвескамі і выявай багіні Нікі на квадрызе.

Караль Касцюшка-Валюжыніч з гонарам паведаміў у археалагічную камісію: "Я шчаслівы, што маё прадказанне збылося і што не толькі ў Керчы знаходзяць упрыгажэнні з золата, камеі і шкляны посуд. Збудзецца яшчэ многае, што датычыць старажытнага Херсанеса... Ён, нарэшце, адкрыўся безапеляцыйна; і з глыбіні

* *Перыбал (грэц. περίβολος — акружнасць, абрыс) — агароджа вакол храма; тэрыторыя паміж вонкавай і нутраной сцяной.*

** *Гідрыя (стар.-грэц. ὑδρία, ад ὕδωρ — вада) — пасудзіна насіць ваду; мела дзве гарызантальныя ручкі і адну, размешчаную вертыкальна.*

дзесяціаршыннай шахты, за некалькі крокаў ад манастырскага ўезда, пад брамкай з мармуровым парогам, якую з вялікімі цяжкасцямі і небяспекай удалося захаваць, падпёршы бярвёнамі, зноў выглянула на Божы свет брама старажытнага горада IV стагоддзя да Нараджэння Хрыстова, адмысловай муроўкі рустамі*, без вапны. Шмат стагоддзяў таптала гэтае месца візантыйцы і татары, што жылі тут, і, нарэшце, сотні тысяч багамольцаў, турыстаў і вучоных, якія не падазравалі, што пад імі пахавана цэлая маленькая Троя з некранутымі магіламі знакамітых грамадзян. Дапусцім, што з гэтых магіл, ацалелых толькі дзякуючы штучнай засыпцы, падняццю сцяны і пракладванню дарогі ў рымскую эпоху, выяўлена пакуль адна. Але гэтая адна прыгажосцю вырабаў, а галоўнае — сваім статусам, даражэйшая, магчыма, за ўсе яшчэ не адкрытыя, бо яна змешчаная пад мурам на скале, адначасова з будаўніцтвам муру, усяго за адзін аршын ад прахону брамы. Таму, мяркую, яна належыць сцена- і горадабудаўніку з пачцівай жонкай і дзецьмі".

Яшчэ два скляпы, прыбудаваныя да абарончага муру, былі выяўленыя побач. Тут таксама агледзелі шматлікія ўпрыгажэнні: залатыя каралі з падвескай у выглядзе матыля з устаўкамі з паўкаштоўных камянёў і каляровага шкла, скульптурка зайчыка з горнага крышталя.

Раней лічылася, што Херсанес быў нагэтулькі бедны, што не меў нават уласнага посуду, і яго даводзілася ўвозіць. Але на ўчастку, прылеглым да вонкавага боку баявога муру, непадалёк ад вялікай флангавай вежы, былі выяўленыя керамічныя майстэрні: печы для абпалу посуду і высечаныя ў скале ямы для падрыхтоўкі гліны.

Археалогію часам іранічна называюць "навукай пра чарапкі". Вырабы з гліны — найбольш масавыя знаходкі. Пры вывучэнні шматпластавых помнікаў, да ліку якіх належыць Херсанес, керамічныя вырабы дазваляюць скласці ўяўленне пра час будаўніцтва або гібелі таго ці іншага збудавання. І паказальнае заключэнне Касцюшкі, зробленае пад час раскопак з вонкавага

---

* *Руст — камень, апрацаваны звонку наступным чынам: па перыметры рабілі гладкую вузкую палосу, а астатнюю паверхню апрацоўвалі груба, што надавала сцяне будынка дэкаратыўны эфект.*

боку абарончага муру. Ён пісаў: "...раскопкі палягалі тут у сістэматычным выдаленні з дапамогай ваганетак культурных напластаванняў асобных эпох: спачатку — верхняй, візантыйскай, пасля — рымскай і, нарэшце, — грэцкай аўтаномнай, да самай мацерыковай скалы, пры якой нават знайшлі некалькі прыладаў каменнага веку ў выглядзе крамянёвых і абсідыянавых скрэблаў. Тут на працягу многіх стагоддзяў выкідалі за сцяну чарапкі бітага посуду і іншую непатрэбшчыну, таму паслядоўныя раскопкі ў гэтым месцы нагэтулькі цікавыя і павучальныя, што маглі б служыць практычнай школай для асобаў, якія вывучаюць археалогію. Выдаляючы адно за адным напластаванні, вы можаце скласці поўны вопіс тых знаходак, якія адносяцца да пэўнай эпохі, бо, дзякуючы цалкам выключнай і пакуль не высветленай з'яве, сцены ўсіх трох названых эпох захаваліся ва ўсёй іх пачатковай красе, і да складзенага намі падрабязнага вопісу знаходак дадаецца яшчэ беспрэцэдэнтная архітэктурная ілюстрацыя!

Вось месца, цалкам вартае таго, каб нашы навукоўцы-археолагі ў час вакацый чыталі лекцыі з гісторыі старажытнага Херсанеса, без усялякіх выдаткаў на туманныя карцінкі".

# СПРАВА ЎСЯГО ЖЫЦЦЯ

*Змаганне на два франты * Сховішча мясцовых старажытнасцяў * Багаты збор антычных артэфактаў * Падарожжа ў глыбіню стагоддзяў * Набліжалася вайна... * "Жудасна ад думкі, што не дажыву да новага музея" * Апошняя экспедыцыя * Матэрыялы для будучай кнігі*

Кожны даследнік пераадольвае нялёгкі шлях сумневаў, барацьбы з сабой і спрэчак з апанентамі на шляху пошуку рэалій гістарычнага жыцця. Пры стварэнні музея – Склада мясцовых старажытнасцяў – К. Касцюшку-Валюжынічу давялося пераадольваць і супраціў манастырскага начальства, і неразуменне, якое часам праяўлялася з боку кіраўніцтва археалагічнай камісіі. "Наконт стварэння музея ў Херсанесе я сумняваюся. Многія добрыя рэчы, а можа быць – нават лепшыя, знаходзяцца ў музеях, і патрабаваць усё гэта назад для ўтойвання ў глухім сховішчы немагчыма", – пісаў І. Талстой, гісторык, спецыяліст у галіне нумізматыкі.

І ўсё ж у 1892 годзе ў збудаваным на беразе Каранціннай бухты будынку адкрыўся музей. Праўда, К. Касцюшку-Валюжынічу ўвесь час нагадвалі, што "цяперашняя калекцыя Вашага Склада мае часовае значэнне; археалагічная камісія паводле статута не засноўвае музеяў; ніводны спецыяліст не будзе вывучаць херсанескія старажытнасці па злепках і фатаграфіях, калі мае магчымасць вывучаць іх у Маскве ці Пецярбурзе па арыгінале. Пры гэтым выраб і злепкаў, і фатаграфій патрабуе новых выдаткаў, якія лепш скарыстаць на раскопкі. Продаж выданняў Камісіі пры Вашым Складзе, відаць, немэтазгодны. Ці варта адчыняць краму для трох-чатырох чалавек? Мабыць жа, бальшыня Вашых наведнікаў багамольцы. Карысці ад гэтага для археалогіі не будзе", – так пісаў К. Касцюшку-Валюжынічу В. Тызенгаўзэн, другая асоба ў археалагічнай камісіі.

Найбольш салідныя знаходкі штогод накіроўвалі ў сталічны Эрмітаж "для Найвышэйшага агляду" і ў Гістарычны музей. І ўсё ж Касцюшка лічыў, што Херсанескі музей можа паказваць шмат цікавага (прадметы, вывезеныя адсюль у іншыя музеі, фатаграфаваліся). Тут захоўваўся самы багаты збор грэцкіх і рымскіх надпісаў, узораў разьбы па мармуры розных часоў, калоны, капітэлі; разнастайныя прадметы старажытнага побыту: зброя, упрыгажэнні, амфары, тэракотавыя статуэткі, абломкі цудоўных вазаў з жывапісам, посуд разнастайных тыпаў і часоў, візантыйскі паліваны посуд, гіркі, шалі, падсвечнікі...

У апісанні Сховішча старажытнасцяў, пададзеным у адной з публікацый тых часоў, гаворыцца: «Будынак быў падзелены на дзве часткі: у адной — памяшканне для вартаўніка з сям'ёй, у другой — памяшканне для знаходак. Экспанаты размяшчаліся па шафах, за шклом, развешваліся на сценах у строгім парадку, у залежнасці ад эпохі: паганскай і хрысціянскай. У шафах — слязніцы, каралі, кавалачкі золата, манеты, бранзалеты, крыжыкі, кубачкі, амфаркі, статуэткі, лямпачкі і мноства іншых надзвычай цікавых рэчаў. У розных месцах стаяць урны, гліняныя судзіны; далей — невялічкая каменная труна, знойдзеная ў катакомбе, у скале. На ёй грэцкія надпісы — імёны памерлых. Тут і знакамітая стэла з прыгожым грэцкім надпісам, які выдатна захаваўся. Гэта — "грамадзянская Прысяга херсанесітаў". Стан гэтых прадметаў даволі добры, і яны дужа імпануюць "паказному" боку.

Агляд музея закліканы настроіць наведвальніка Херсанеса на "гістарычны лад", пасля чаго дамы, вуліцы, завулкі, вялікія храмы, маленькія капліцкі, падвальныя паверхі, цыстэрны, вадаёмы пачыналі гаварыць і прымушалі думкамі перанесціся ў глыбіню стагоддзяў.

Усё сведчыць пра тое, што пры сістэматычным размяшчэнні экспанатаў у прасторным каменным будынку музей у Херсанесе ўяўляе вельмі павучальную і цікавую карціну жыцця той старажытнай калоніі, якой Русь абавязаная першымі промнямі хрысціянскага святла».

У гісторыі развіцця Херсанескага музея, калі не ўлічваць існаванне манастырскага Сховішча старажытнасцяў, самы цяжкі этап прыпаў на гады дзейнасці К. Касцюшкі-Валюжыніча. На ягоную долю выпала змаганне,

у сутнасці, на два франты: з манастыром і з кіраўніцтвам Імператарскай археалагічнай камісіі, якая размяркоўвала знаходкі па розных музеях.

На пачатку XX стагоддзя нарэшце было прынятае рашэнне аб узвядзенні спецыяльнага будынка для музея, але набліжалася Расейска-японская вайна. І К. Касцюшка-Валюжыніч разумеў, што "для Херсанеса, які ніколі не дасягне значэння Рыма ці Афінаў, было б немэтазгодна будаваць статысячны музей нават тады, калі ў Расеі не было куды дзець грошы; у цяперашні ж цяжкі час нам варта зусім адмовіцца ад хадайніцтва пра асаблівую суму для музея. Але праз тое, што пабудова яго дужа неабходная як з прычыны перапаўнення цяперашняга сховішча, так і праз важныя вайсковыя меркаванні, трэба распачаць пабудову сціплага, але даволі прыстойнага і змяшчальнага музея.

Жудасна становіцца ад думкі, што не дажыву да новага музея. А мне так хацелася б самому ўсё ўладкаваць і спарадкаваць у новым будынку. Калі праект стварэння Херсанескай археалагічнай станцыі не сустрэне спачування, то справе далейшага навуковага даследавання Херсанеса будзе нанесены смяротны ўдар. Выхаваўчае значэнне раскопак для рускага народа будзе страчанае, і за Херсанесам застанецца толькі адна роля – пастаўляць матэрыялы для археалагічных архіваў"*.

28 верасня 1907 года каля Ялты-Яліты, на мысе Ай-Тадор, пачаліся раскопкі рымскай фартэцы Харакс. У часе наведвання гэтых раскопак К. Касцюшка-Валюжыніч трапіў пад доўгую залеву і прастудзіўся, што мела трагічныя наступствы. Больш за месяц хвароба працякала вяла, але пад канец лістапада абвастрылася. Як на тое, у пакоі, дзе знаходзіўся хворы, было вельмі сыра і халодна. Моцны запаленчы працэс закрануў адзінае лёгкае. Самаахвярны даследнік не дажыў да адкрыцця новага музея ў асобным адмысловым будынку. 14 (27 паводле новага стылю) снежня К. Касцюшка-Валюжыніч памёр ад вострай пнеўманіі і сэпсісу ў лякарні Чырвонага Крыжа. Ягоная жонка Марыя Паўлаўна, народжаная Рэвільёці, удава шляхціча Джаксона, пасля

---

* *Архіў Нацыянальнага запаведніка "Херсанес Таўрыцкі", справа 41, аркуш 60.*

смерці К. Касцюшкі-Валюжыніча жыла з дачкой Марыяй у Севастопалі на вул. Малая Марская; ёй і аслепламу пад час Расейска-японскай вайны сыну Пятру была прызначаная пенсія. Сямейны архіў К. Касцюшкі-Валюжыніча захоўваўся ў дачкі, якая пераехала разам з маці ў Бахчысарай, а перад Вялікай Айчыннай вайной – у Харкаў. Сын яе (унук Караля), вайсковы будаўнік, у 1938 годзе быў рэпрэсаваны як асоба шляхоцкага паходжання. А любімая ўнучка Вольга ў 1923 годзе выйшла замуж за Арманда Хамэра* – амерыканскага мультымільянера, які няраз быў у Расеі.

К. Касцюшка-Валюжыніч памёр за два-тры месяцы да выхаду на пенсію. Выйшаўшы на заслужаны адпачынак, ён збіраўся прысвяціць сябе напісанню капітальнай кнігі пра Херсанес, частка раздзелаў якой ужо была створана. Касцюшка добра ўсведамляў сумныя перспектывы свайго здароўя і ўсе апошнія гады, асабліва за два месяцы да смерці, працаваў з рукапісамі (на жаль, яны бясследна зніклі ў гады Другой сусветнай вайны).

Пра тое, што даследнік паслядоўна і мэтанакіравана збіраў матэрыялы для будучай кнігі, сведчыць ягоны архіў, у якім сабраныя копіі дакументаў, што адносяцца да перыяду да 1888 года, лісты ягоных карэспандэнтаў і копіі адказаў на іх, выразкі з газет, дзе асвятляліся вынікі раскопак. Найлепшым адлюстраваннем намераў К. Касцюшкі-Валюжыніча з'яўляецца рапарт справавода археалагічнай камісіі, які пасля скону даследніка павінен быў выбраць для адпраўкі ў Пецярбург матэрыялы: «Знайшоўшы архіў у выдатным стане – у адпаведных тэчках, я адабраў для адпраўкі ў Камісію матэрыялы раскопак да 1908 года і нявыдадзеныя працы Касцюшкі. Працы наступныя:

А) Цалкам гатовая да друку праца пра амфарныя ручкі з шматлікімі табліцамі.

Б) Атлас арнаментаў на донцах чарналакавых судзінаў.

В) Корпус херсанескіх манет у злепках.

Г) Корпус надпісаў на грузілах.

Д) Корпус разных камянёў у злепках.

Е) Пачаты адразу з некалькіх канцоў "Нарыс гісторыі і археалогіі Херсанеса"».

---

* *Хаммер А. Мой двадцатый век: Пути и встречи. М., 1988.*

Напружаная арганізацыйна-даследніцкая праца забірала ў нашага героя амаль увесь час. Відаць, таму ён мала пісаў для публікацый. Тым не менш загадчык раскопак надаваў вялікае значэнне папулярызацыі гісторыі Херсанеса. Збольшага гэтую задачу выконвалі артыкулы ў мясцовым "Крымскім весніку". Калі чытаеш іх, адчуваецца значны ўплыў Касцюшкі. Больш за тое, ствараецца ўражанне, што некаторыя наўпрост "надыктаваныя" ім (на асобных выразках з газет прысутнічаюць ягоныя выпраўленні і ўдакладненні). Пра тое сведчаць і рэдакцыйныя заўвагі, у якіх адзначаецца, што інфармацыя "ласкава перададзеная К. К.".

Незадоўга да смерці К. Касцюшка-Валюжыніч пісаў П. Уваравай: "Як архонт* мёртвага горада, я пасяліўся на яго руінах, заўсёды знаходжуся там і хацеў бы нават быць пахаваным у Херсанесе, але, як паганец, паводле меркавання тутэйшых святых айцоў, вядома, не заслужыў такога гонару". Аднак жа ён заслужыў "такі гонар": ягоная магіла размешчаная непадалёк ад цэнтральнай плошчы старажытнага горада, які, дзякуючы ягоным працам, стаў запаведнікам і атрымаў сусветную вядомасць.

---

* *Архонт (стар.-грэц. ἄρχων — начальнік, кіраўнік; ад ἀρχή — пачатак, улада) — найвышэйшая службовая асоба ў старажытнагрэцкіх полісах.*

# КАБ ЧАС НЕ ЗРУЙНАВАЎ ЗРОБЛЕНАГА

*Звароты з прэфіксам "най-" ✻ Беды Херсанеса як асабістая драма ✻ Вынікі раскопак у працах іншых навукоўцаў ✻ Успаміны сучаснікаў ✻ Бясконца аддданы Херсанесу ✻ Неспакойныя падзеі ў Севастопалі ✻ Паслужны спіс і ўзнагароды ✻ Талент, інтуіцыя і ўдача*

У шматлікіх лістах, якія захаваліся да нашага часу, адрасанты – калегі і сябры Імператарскай археалагічнай камісіі – звярталіся да Караля Касцюшкі-Валюжыніча са словамі: "найсумленнейшы", "найпрацавіцейшы", "найдабрэйшы", "найсціплейшы", "найакуратнейшы", "найгасціннейшы" і г. д. І гэта не фармальнае захаванне звычайных у тыя гады правілаў добрага тону – гэта шчырая праўда. Ягонае клапатлівае стаўленне да работнікаў, бескарыслівае імкненне дапамагчы людзям, акуратнае вядзенне археалагічнай дакументацыі пацвярджаюць такія характарыстыкі.

Жыццё нашага героя часам было вельмі цяжкім. Усё, што несла шкоду Херсанесу, ён успрымаў як асабістую драму – узвядзенне манастырскіх будынкаў, размяшчэнне артылерыйскіх батарэй на гарадзішчы... Ён змагаўся, як мог, але і з ім змагаліся: адзін з настаяцеляў манастыра пісаў на яго даносы, вінавацячы яго, каталіка, у свядомай варожасці да праваслаўнага манастыра; старшыня археалагічнай камісіі граф А. Бобрынскі тлумачыў яму, што інтарэсы Вайсковага ведамства стаяць вышэй за археалагічныя; масцітыя вучоныя, бываючы ў Херсанесе праездам, крытыкавалі ягоныя раскопкі, "якія вядуцца без пэўнага плана", і сістэму захоўвання экспанатаў у музеі.

Касцюшка ж тым часам акуратна падшываў усе дакументы, дадаючы пазнаку: "Для будучага гісторыка Херсанескага музея". Адказваючы на заўвагі пра

адсутнасць строгага плана раскопак, ён пісаў: "Дазволю сабе спытаць: ці былі б адкрытыя каштоўныя эпіграфічныя помнікі, між якіх першае месца займае Прысяга, каб не было раскопак на плошчы ў цэнтры горада? Ці можна паручыцца, што ў той час (магчыма, праз дзесяць гадоў), калі раскопкі дайшлі б нарэшце да плошчы, дзе стаіць асвечаны ў 1891 годзе храм і дзе сёння растуць пасаджаныя дрэвы, – манастырскае начальства дазволіла б перакапаць гэтую плошчу? А між тым менавіта тут і адкрытыя найбольш каштоўныя помнікі, з ліку якіх дастаткова згадаць Прысягу, мармуровыя з надпісамі пастаменты да статуй, невялікае каменнае скляпенне з надпісам XII стагоддзя, мармуровага льва ды купель". І адначасова прапаноўваў: "Беручы пад увагу галоўным чынам бюджэт і неадкладную неабходнасць выратаваць ад забруджвання і разбурэння ўсё тое, што ўжо адкрыта на працягу чатырох гадоў, – усе адкрытыя храмы, як, напрыклад, тыя два, што з паўднёвага боку сабора, – трэба ўсё гэта прывесці ў ахайны выгляд, паставіць паказальнікі, згодна з даведнікам, які неабходна выдаць у недалёкай будучыні".

Паказчыкам таго, што Касцюшка-Валюжыніч паспяхова пераадольваў усе цяжкасці, з'яўляюцца словы старшыні Імператарскай археалагічнай камісіі А. Бобрынскага: "Памятаеце, гэта было ў дні поўнага зацьмення? Для Херсанеса новае сонца з тае пары свяціла так ясна і няспынна; Вашая нястомная энергія, Вашыя цярпенне і акуратнасць прывялі да вынікаў, якімі Вы можаце з поўным правам ганарыцца. Ніхто – нават з заўзятых скептыкаў – не будзе адмаўляць і сумнявацца ні ў важнасці раскопак у Херсанесе, ні ў факце, што адкрыццём гэтай крыніцы навуковага святла мы цалкам абавязаныя Вам... Вы ўзбагацілі музей каштоўнымі прадметамі старажытнага побыту і выявілі цэлым разбураных старонак мінулага".

Дзякуючы працам К. Касцюшкі-Валюжыніча змагла з'явіцца кніга Д. Айналава "Руіны храмаў", шматлікія публікацыі эпіграфічных знаходак В. Латышава і ягоны фундаментальны корпус надпісаў "Inscriptiones antiquae orae Septentrionalis Ponti Euxini", які не страціў навуковага значэння і ў нашыя дні. Аўтар манаграфіі "Нарысы з гісторыі Херсанеса ў VI–X стагоддзях па Нар. Хр."

Д. Шастакоў* пісаў пра загадчыка раскопак: «Я згадваю сваё знаёмства з ветлівым і сімпатычным гаспадаром херсанескіх раскопак улетку 1903 года, калі мне ўдалося скарыстацца ягоным кіраўніцтвам пры азнаямленні з помнікамі Херсанеса. Згадваю яго несканчоны, жывы і надта цікавы аповед пра Херсанес і яго старажытнасці пад час нашых гутарак на беразе мора або ў маленькім кабінеце, каля ягонага "дзіцяці" – Херсанескага музея, які ніколі не пуставаў. Прычым частыя наведнікі заўсёды сустракалі з боку К. Касцюшкі-Валюжыніча гатоўнасць да тлумачэння старажытнасцяў». Бясконца адданы Херсанесу, ён імкнуўся падзяліцца бачаннем гісторыі горада з кожным, хто прыязджаў у Севастопаль на навуковыя экскурсіі.

У 1898–1901 гадах помнікі Керчы, Херсанеса і Ольвіі вывучаў ангельскі гісторык, прафесар Кембрыджскага ўніверсітэта Эліяс Ховэл Мінз (1874–1953), які пісаў пазней у адным з лістоў: "Пад час знаходжання там я быў заняты азнаямленнем з раскопкамі ў Херсанесе Таўрыцкім, якія праводзіў тут К. Касцюшка-Валюжыніч. Ён дазволіў мне карыстацца сваёй бібліятэкай і азнаёміцца з ягонымі дэталёвымі справаздачамі па кожным сезоне".

Захаваўся ліст Э. Мінза да К. Касцюшкі-Валюжыніча, пасланы праз год пасля наведвання Херсанеса: "Вельмішаноўны Кароль Казіміравіч! Як маецца слаўны горад Корсунь? І загадчык раскопак у ім? Спадзяюся, што ўсё ідзе рукою, што Вы здаровыя і што манахі не надта замінаюць добрай справе. Дзе Вы капаеце сёлета? І якія цуды здабываеце з сырой зямлі? У нас цяпер дождж ліе бязлітасна, але я быццам бачу перад вачыма сіняе мора, Каранцінную бухту і белы мыс, на якім калісьці ўзвышаліся храмы Херсанеса. Ці пачалі будаваць выдзелены музей? Імператару вельмі спадабаліся

---

* *Дзмітрый Шастакоў (1869–1937) – візантыніст і гісторык культуры з казанскай дынастыі гісторыкаў; аўтар першай навуковай працы з гісторыі сярэднявечнага Херсона (пра яго гл.: Шмелева Л. М. Казанские антиковеды Шестаковы – университетская династия // Историки в поиске смыслов: сб. научных статей и сообщений участников Всероссийской научной конф., посвященной 90-летию со дня рождения проф. А. С. Шофмана и 60-летию со дня рождения проф. В. Д. Жигулина. Казань, 2003. С. 175–179).*

вынікі апошніх раскопак, хіба не так? Прайшоў амаль цэлы год, як я быў у Вас. За гэты час мае заняткі ішлі наперад не так хутка, як я хацеў бы".

А ў 1906 годзе ён пісаў: "Здарэнне ў Севастопалі прымусіла мяне турбавацца за Вас і за Херсанес". Гаворка ідзе пра падзеі 1905 года, у сувязі з якімі К. Касцюшка-Валюжыніч накіраваў у Пецярбург рапарт (18 лістапада 1905 года) і дадаў "Адозву Севастопальскага гараданачальніка". У рапарце ён паведамляў: «У часе расстрэльвання крэйсера "Ачакаў", які стаяў на рэйдзе першым да выхаду ў мора побач з Херсанесам, некалькі выпушчаных па крэйсеры снарадаў зрабілі пералёт, разарваліся над херсанескім гарадзішчам (шкоды не нарабілі).

А першай гадзіне ночы на 17 лістапада галоўны завадатар збунтаванага войска адстаўны капітан 2-га рангу Шміт і ягоны сын былі прывезеныя пад моцным канвоем з браняноснага карабля "Расціслаў" на параВым катэры да малой прыстані каля музея і адсюль адпраўленыя на галоўную гаўптвахту фартэцы. З'яўленне ў цёмную ноч узброеных матросаў на плошчы музея моцна напалохала ўсіх нас, асабліва вартаўніка.

Работнікі пры раскопках увесь час паводзілі сябе бездакорна і, нягледзячы на эпідэмію забастовак, не прапусцілі ніводнага дня і не выказалі новых прэтэнзій і патрабаванняў...», таму Касцюшка прасіў павялічыць усім плату на 20 кап. (з 80 кап. да 1 руб.).

Вось выпіс з паслужнога спіса ад 9 студзеня 1906 года: "Карл Казіміравіч Касцюшка-Валюжыніч, тытулярны саветнік (веравызнанне рымска-каталіцкае), з 11 студзеня 1903 года вызвалены за выслугу гадоў; да судовай адказнасці не прыцягваўся; прадстаўлены да калежскага асэсара з 11 студзеня 1906 года. Мае ордэны: св. Ганны – 3 ст., св. Станіслава – 3 ст.; прадстаўлены да ордэна св. Станіслава – 2 ст. Клас пасады – VI. Ганну атрымаў у 1897 годзе 13 красавіка за працавітасць і заслугі ў даследаванні Херсанеса"*.

Раскопкам К. Касцюшкі-Валюжыніча спадарожнічалі і ўдача, і навуковая інтуіцыя. Уважлівае вывучэнне месцаў будучых даследаванняў гарадзішча спрыяла ягоным адкрыццям. Адзін з работнікаў так казаў пра

---

* *Архіў Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры (С.-Пецярбург), фонд 1/1891, справа 149, аркушы 69–71.*

яго: «Былі б сродкі – мы з Карлам Казіміравічам такіх бы тут спраў нарабілі, такіх бы рэчаў накапалі, што толькі глядзі ды любуйся. Бо Карл Казіміравіч гэтую музыку выдатна разумеюць; яны нібы праз зямлю ўсё бачаць. Скажуць: “Пётра, вось тут бы капнуць, тут, маўляў, нямала што знойдзецца”».

Ён ажыццявіў маштабныя раскопкі плошчы старажытнага горада: адкрыў жылыя кварталы і вуліцы, крамы і майстэрні, грамадскія будынкі і багата дэкараваныя цэрквы з мазаічнымі падлогамі, сістэму водазабеспячэння і капітальныя абарончыя збудаванні. Рабіў даследнік раскопкі і па-за межамі Херсанеса – у раёне мыса Фіялент і на беразе Казачай бухты, на Гераклейскім паўвостраве. Праўда, яны былі нядоўгімі, і сістэматычнае даследаванне хоры Херсанеса пачалося толькі ў 60-х гадах XX стагоддзя.

У зацішным жытле на пустэльным беразе, дзе калісьці кіпела жыццё грэцкага горада, вывучаў ён рэчавыя помнікі мінуўшчыны. У яго не было сталых памочнікаў, акрамя зяця, афіцэра В. Рота, чарцёжніка М. Скубетава* ды тых найманых работнікаў, якія працавалі на раскопках на працягу многіх сезонаў. Разам з Касцюшкам, які апісваў і вызначаў многія тысячы знаходак, яны адкрылі больш за 1000 метраў абарончага муру, аснова якога залягала часам на 5-метровай глыбіні, 12 манументальных вежаў, з якіх найбольш вядомай з'яўляецца вежа Зянона, больш за 10 буйных храмаў і шматлікіх квартальных капліц, жылых кварталаў і каля 2000 пахаванняў на некропалі.

Заслугі К. Касцюшкі-Валюжыніча, археолага-практыка, у даследаванні антычнай спадчыны агульнапрызнаныя**. Ягонае імя з павагай вымаўляецца нашчад-

---

* *Марцін Скубетаў (1872–?; прапаў без вестак), чарцёжнік у Херсанесе ў пачатку XX стагоддзя; у 1900 годзе браў удзел у пабудове браняносцаў “Расціслаў” і “12 апосталаў” у Нікалаеве.*

** *Варта адзначыць яшчэ двух нашых суайчыннікаў, якія даследавалі антычную спадчыну. Гэта Максімілян Рыла з Падароска і Жыгімонт Мінейка з-пад Гальшанаў.*

*Максімілян Рыла (1802–1848) скончыў Полацкую езуіцкую акадэмію, вучыўся ў Віленскім універсітэце. Потым прадоўжыў навучанне ў Грыгарыянскім універсітэце ў Рыме, дзе атрымаў званне прафесара філасофіі. У 1839 годзе заснаваў у Бейруце Азіяцкі*

камі на працягу многіх дзесяцігоддзяў. Матэрыялы раскопак Касцюшкі выкарыстоўваюць гісторыкі і нашых дзён, а дзейнасці даследніка прысвячаюцца артыкулы і навукова-папулярныя працы*. Без звароту да яго навуковай спадчыны – матэрыялаў раскопак – немагчыма стварэнне цэласнага ўяўлення пра гісторыю Херсанеса-Херсона.

У Херсанесе, як пісаў у канцы XIX стагоддзя А. Бобрынскі, "хопіць справы і месца для правільнага вядзення раскопак яшчэ на доўгія гады"**. Вялікая роля ў пе-ратварэнні Херсанеса ў музей пад адкрытым небам належыць Іне Антонавай (1926–2000), выпускніцы Ленінградскага ўніверсітэта, якая да прызначэння дырэктарам Херсанескага музея ў 1951–1955 гадах працавала старшым інспектарам аддзела па ахове помнікаў у Херсонскай вобласці. Яе вялікая заслуга – у арганізацыі рэстаўрацыйных майстэрняў, у стварэнні такога выдання, як "Паведамленні Херсанескага музея", у выданні букле-

---

*калегіюм, з 1844 года – рэктар Рымскага калегіюма. Упершыню даследаваў руіны старажытнага Вавілона. Ахвяраваў музею Ватыкана багатую калекцыю археалагічных знаходак.*

*Жыгімонт Мінейка (1840–1925) за ўдзел у паўстанні 1863–1864 гадоў быў высланы на Нерчынскія руднікі, змог уцячы адтуль і дасягнуць Еўропы. У Парыжы скончыў Вайсковую акадэмію (1868) і як вайсковы інжынер браў удзел у будаўніцтве першых чыгунак у Грэцыі. Апынуўшыся ў Эпіры, ён захапіўся археалогіяй і стаў адкрывальнікам знакамітага ў старажытнасці свяцілішча Зеўса ў Дадоне. Ён нагэтулькі ўдала спланаваў раскопкі, што выявіў акропаль, храм з велічнай каланадай, статуі і вялікую колькасць таблічак з адказамі аракула. Так, дзякуючы ягоным работам, і стала вядомае другое пасля Дэльфаў свяцілішча, пра якое згадвалі антычныя аўтары.*

* *Напрыклад, гл.: Антонова И. А. Основатель Херсонесского музея // Крымский архив (Симферополь). 1997. № 3. С. 57–67; Антонова И. А. К. К. Косцюшко-Валюжинич – основатель Херсонесского музея // Nomos: Kwartalnik religioznawczy (Krakуw). 1999/2000. № 28/29. S. 29–40; Романчук А. И. Возрождение античного города. Свердловск, 1991.*

** *Бобринский А. А. Путевые заметки от личного впечатления от Петербурга, Москвы, Харькова, Симферополя, Бахчисарая, Альмы, Инкермана, Севастополя, Херсонеса, Ялты // Архіў Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры (С.-Пецярбург), фонд 25/1891, справа 22, аркуш 13.*

таў і даведнікаў па Херсанесе*. Пры ёй намаганнямі некалькіх універсітэтаў пачатае адначасовае даследаванне аднаго з кварталаў у партовым раёне, створаная новая экспазіцыя ў двух будынках, адпаведна дзвюм гістарычным эпохам – антычнай і сярэднявечнай. У цяперашні час збор музея налічвае больш за 200 тысяч экспанатаў, многія з якіх унікальныя. А запаведнік займае плошчу каля 30 гектараў. Значная частка яе яшчэ не вывучаная, але ў наш час з'явіліся новыя магчымасці планавання даследаванняў археалагічных аб'ектаў. Папярэднюю выведку робяць з выкарыстаннем аэрафотаздымкаў на значных абшарах, якія ў бліжэйшыя гады, бадай, не будуць раскапаныя. Гэта вывучэнне і хоры антычных цэнтраў Паўночнага Прычарнамор'я, і непасрэдна херсанескага гарадзішча**.

На пасадзе загадчыка Сховішча мясцовых старажытнасцяў напоўніцу раскрыўся талент К. Касцюшкі-Валюжыніча. І архіўныя дакументы дазваляюць прасачыць не толькі гісторыю раскопак і фармаванне музейнай калекцыі, але збольшага ўявіць і асобу гэтага незвычайнага чалавека***.

У Браслаўскім і Верхнядзвінскім гістарычна-краязнаўчых музеях К. Касцюшку-Валюжынічу – адкрывальніку таямніц старажытнага Херсанеса і найцікавейшых старонак сусветнай гісторыі – прысвечаны экспазіцыі, матэрыялы для якіх перададзены адным з аўтараў гэтай кніжкі. Можна спадзявацца, што з часам у гэтых раённых цэнтрах з'явяцца вуліцы яго імя, мемарыяльная табліца і бронзавы бюст на гранітным пастаменце. Ён заслужыў гэта бязмежнай адданасцю навуцы і самаахвярнасцю.

За перыяд 1888–1907 гадоў К. Касцюшка-Валюжыніч апублікаваў толькі тры невялікія артыкулы ў "Вестках Таўрыцкай вучонай архіўнай камісіі" і "Запісках

---

* *Пра гэта гл.: Шацко Г. О. І. А. Антонова і археологічне дослідження Херсонеса // Археологія. 2000. № 4. С. 123–125.*

** *Вынікі аэрафотаздымкі херсанескага гарадзішча ў 2005 г. выкладзены ў публікацыі: Романчук А. И., Филиппов В. А. Результаты применения разведочной аэрофотосъемки западной части Херсонеса Таврического в 2005 г.: Научный доклад. Севастополь; Тюмень; Екатеринбург, 2005.*

*** *Гл. пра гэта: Романчук А. И. К. К. Косцюшко-Валюжинич: Этюды повседневности. Saarbrücken, 2014.*

Адэскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў". Ён збіраўся абагульніць вынікі 20-гадовых раскопак, але... не паспеў.

Навуковыя ідэі і гіпотэзы, якія ўзніклі ў пачатковы перыяд даследавання Херсанеса, пазней атрымалі развіццё. Гэта характэрна і для такога аспекту дзейнасці Касцюшкі, як стварэнне музейнай экспазіцыі і клопат пра ахову помнікаў гарадзішча. Першым аглядам ягонай працы ў стварэнні музея стала штогадовае асвятленне вынікаў раскопак у газетных нарысах М. Энгеля. Іх змест сведчыць, як паступова, з пачаткам сістэматычных даследаванняў, гарадзішча набывала выгляд музея пад голым небам; спынілася бессістэмнае выкопванне старажытнасцяў ды іх крадзеж. Пазней аўтар аб'яднаў нарысы ў кнігу*. Адзін з карэспандэнтаў К. Касцюшкі-Валюжыніча пісаў пра яе: "Праца гэтая надзвычай цікавая таму, што аўтар спрабуе абагульніць вынікі Вашай шматгадовай працы; яна напісаная, аднак, не ў строга навуковым сэнсе, а белетрыстычна. Відавочна, аўтар хацеў папулярызаваць навуковыя пытанні, звязаныя з гісторыяй Херсанеса. Ну і за тое дзякуй!"

У гэтых нарысах пра вынікі раскопак і найбольш характэрныя знаходкі адлюстравана таксама з'яўленне некаторых навуковых гіпотэз, інфармацыя пра створаны Касцюшкам музей, сведчанні пра складаныя ўзаемадачыненні першага загадчыка гарадзішча і кіраўніцтва манастыра. Менавіта ўсведамленне сваёй ролі ў захаванні помнікаў Херсанеса абумовіла змаганне Караля Касцюшкі-Валюжыніча і з манастыром, што займаў частку тэрыторыі гарадзішча, і з некаторымі чыноўнікамі Вайсковага ведамства, якія будавалі ў межах старажытнага муру казармы, парахавы склеп ды іншыя вайсковыя аб'екты. Безумоўна, ён быў не адзіным, хто разумеў значэнне помнікаў Херсанеса для гістарычнай навукі, але менавіта на ягоную долю выпала не толькі "здабыць" неацэнныя скарбы, але і захаваць іх.

---

* *Энгель М. Русская Помпея: Херсонес Таврический. Очерки археологических исследований. Заметки и впечатления. Севастополь, 1903.*

# ПАСЛЯСЛОЎЕ

З даўніх часоў у студэнтаў, якія прыязджаюць на археалагічную практыку ў Херсанес, існуе традыцыя: прамаўляць словы вернасці Херсанесу ля магілы К. Касцюшкі-Валюжыніча, паўтараючы словы адкрытай ім Прысягі херсанесцаў: “Я не здраджу Херсанесу...”*.

Гэтыя словы адлюстроўваюць жыццёвае крэда нашага героя. У адным з пасланняў у археалагічную камісію ён пісаў: “Я так аддапы справе даследавання Херсанеса і, як фанатык, так далёка зайшоў, што вяртання няма! Для мяне развітацца з Херсанесам – усё роўна, што развітацца з жыццём”.

Некаторыя з сучасных археолагаў часам папракаюць Касцюшку ў тым, што ён не ўсведамляў значнасці сярэднявечных знаходак і комплексаў. Гэта не адпавядае сапраўднасці. Напрыклад, пра бронзавы крыж са славянізаванымі надпісамі даследнік казаў, што гэта сведчанне таго, адкуль прыйшлі да нас хрысціянства і культура.

* *Вось тэкст Прысягі – дакумента, прынятага народным сходам, відаць, у неспакойныя гады, калі з поўначы і ўсходу навісла пагроза землям дзяржавы, калі ворагі дэмакратыі пачалі ўзнімаць галаву і ў самім горадзе: “Клянуся Зеўсам, Зямлёй, Сонцам, Дзевай і багамі, багінямі і героямі алімпійскімі, якія валодаюць горадам і зямлёю і ўмацаваннямі херсанесітаў: я буду аднадумным наконт дабрабыту і свабоды горада і грамадзян і не аддам ні Херсанеса, ні Керкінітыды, ні Цудоўнай гавані, ні іншых умацаванняў і земляў, якімі херсанесіты валодаюць, нічога нікому – ні эліну, ні варвару, але буду ахоўваць для народа херсанесітаў і не парушу дэмакратыі, а ахвотнаму здрадзіць або парушыць не дазволю і не ўтаю разам з ім, але заяўлю гарадскім дэміургам, і ворагам буду ліхадуму і здрадніку, які наважыцца схіліць да аддзялення Херсанес або Керкінітыду, або Цудоўную гавань, або ўмацаванні і землі херсанесітаў, і буду служыць дэміургам як мага лепей і справядлівей для горада і грамадзян, народ ахаваю і не перадам на словах нічога таемнага ні эліну, ні варвару, што можа нашкодзіць гораду...”. Перакладнік помніка В. Латышаў пісаў, што сваёй захаванасцю “клятва херсанесітаў перасягае афінскую”, а паводле пайнаты зместу ёй няма роўных.*

Найвышэйшая ўлада – імператар і вялікія князі – пад час візітаў у Севастопаль абавязкова аглядалі Херсанес, пра што можна меркаваць па Кнізе наведнікаў, заведзенай загадчыкам музея старажытнасцяў. Цікавасць царскай сям'і да раскопак мела станоўчы аспект. Яна спрычынілася да павелічэння асігнаванняў, а за адкрыццё старажытнагрэцкай брамы і скляпоў каля яе К. Касцюшка-Валюжыніч атрымаў грашовую ўзнагароду.

У Кнізе наведнікаў адлюстраваная ў цэлым цікавасць да музея і раскопак. Сярод тых, хто працаваў са знаходкамі непасрэдна ў Херсанесе, значацца імёны такіх гісторыкаў, як М. Весялоўскі, А. Спіцын, І. Забелін, В. Латышаў, А. Лапо-Данілеўскі, Ю. Кулакоўскі, А. Арэшнікаў, Ф. Браўн, Г. Шлюмбержэ (аўтар даследаванняў па візантыйскіх пячатках). У ёй ёсць роспісы мастакоў і архітэктараў (В. Верашчагіна, А. Карзухіна, М. Чагіна), пісьменніка У. Неміровіча-Данчанкі, артыстаў (М. Савінай, Ф. Горына), вышэйшых вайсковых чыноў. Сярод наведнікаў былі і проста аматары гісторыі. Наведвала Херсанес грэцкая каралева Вольга, герцаг спарцкі Канстанцін, прынц грэцкі Георгі.

Пасылаючы ў археалагічную камісію выпіску з Кнігі наведнікаў, Касцюшка-Валюжыніч адзначаў: "У 1898 годзе распісалася 3182, у 1899 годзе – 3434, 1900 годзе – 5128, 1901 годзе – 6507, 1902 годзе – 8151 чалавек". Усяго ж за 1898–1902 гады ён налічыў 26 452 наведнікі. Вядома, гэтыя лічбы нельга параўнаць з сучасным "музейным бумам", з тым патокам, які можна бачыць у нашыя дні каля дзвярэй Эрмітажа або нейкага іншага сталічнага музея, але рост зацікаўлення Херсанесам відавочны.

Звесткі з аўтабіяграфіі, паслужнога спіса, безумоўна, не даюць уяўлення пра асабістыя якасці К. Касцюшкі-Валюжыніча, але ў адным з лістоў да яго карэспандэнт пісаў, што ён успамінае гасціннасць, якой быў зачараваны ў доме даследніка. Характэрнымі з'яўляюцца і словы ў Памятнай кнізе пра К. Касцюшку-Валюжыніча: "Мір праху, дарагі працаўнік на карысць навукі. Муляр Антон Калашнікаў".

І, мусіць, менавіта самаадданая праца "на карысць навукі" – галоўная рыса характару К. Касцюшкі-Валюжыніча, які дзеля даследаванняў Херсанеса пагарджаў побытавымі выгодамі. Каб быць увесь час на раскопках, ён прыбудаваў да створанага ім Сховішча старажытнас-

цяў некалькі памяшканняў. Захавалася апісанне ягонага працоўнага кабінета і жылля: "Склад старажытнасцяў і кватэра пры Складзе падобныя хутчэй на які-небудзь балаган або павець, чым на жылое памяшканне. Сцены нізкіх і цесных пакояў усюды пакрытыя плямамі, якія сведчаць пра надзвычайную вільгаць; у сталовай пад час праліўных дажджоў або раставання снягоў вада прасочваецца праз столь, печы страшна запушчаныя"*.

Сумленнасць, дабрыня, працавітасць і сціпласць спалучаліся ў ім з годнасцю і самапавагай, упэўненасцю ў сваім прызначэнні. Тонкая назіральнасць даследніка-практыка дазваляла рабіць цікавыя (і правамерныя) гістарычныя высновы, але ён прыслухоўваўся і да меркаванняў сваіх суразмоўцаў. Аднак які бы паважаным ні быў апанент, што абараняў іншы пункт гледжання, Касцюшка-Валюжыніч імкнуўся, грунтуючыся на матэрыялах раскопак, паказаць памылковасць ягоных высноў. У такіх выпадках ён быў непахісны. Нават на парозе смерці ён прыспешваў з раскопкамі абарончых муроў, якія пацвярджалі б ягоныя аргументы пра перыядызацыю іх будаўніцтва ў дыскусіі з А. Бэрцье-Дэлягардам. Ягоная невычэрпная працаздольнасць і бязмежная любоў да Херсанеса заклалі аснову вядомага цяпер на ўвесь свет запаведніка**.

І цалкам заканамерна, што калі Касцюшка-Валюжыніч памёр, не ўзнікла пытання, дзе ён знойдзе апошні прыстанак. Ён быў пахаваны ў двары манастыра, насупраць сабора св. Уладзіміра – на тэрыторыі херсанескага гарадзішча, як сказана ў некралозе, "каталіцкім і праваслаўным духавенствам супольна; настаяцель манастыра сказаў развітальнае слова, у якім пералічваліся шматлікія працы нябожчыка, яго дбайнае служэнне справе раскопак".

На магіле, на сціплым пастаменце з шэрага каменю, узвышаецца мармуровая калона з раскопак Херсанеса. Яна стаіць як сімвал 20-гадовай працы дзеля аднаўлення гісторыі старажытнага горада. На калоне надпіс: "Карл Казимирович Косцюшко-Валюжинич, заведующий

---

* *З ліста дырэктара Керчанскага музея В. Шкарпілы (1853–1918) В. Латышаву.*

** *Антонова И. А. Основатель Херсонесского музея // Крымский архив. 1997. № 3.*

раскопками Херсонеса, род. 20-го апреля 1847 г., сконч. 14-го декабря 1907 г." (даты пададзеныя паводле старога стылю. – *Аўт.*).

У год, калі вырашалася пытанне пра сістэматычныя раскопкі ў Херсанесе, графіня П. Уварава пісала: "Цяжкі і цярністы той шлях, па якім трэба прайсці даследніку Херсанеса". Гэты "цярністы шлях" прайшоў Кароль Касцюшка-Валюжыніч. Матэрыялы ягоных раскопак зрабіліся неацэнным здабыткам навукі. Яны былі выкарыстаныя выдатным расейскім эпіграфістам В. Латышавым (1855–1921), увайшлі ў публікацыі нумізматычных знаходак захавальніка Гістарычнага музея А. Арэшнікава (1855–1933); справаздачы пра раскопкі сталі асновай пры стварэнні манаграфіі візантыніста Д. Айналава (1862–1939); вынікі штогадовых "археалагічных вышукаў" рэгулярна асвятляліся ў мясцовым і цэнтральным перыядычным друку. Нагадаем, што пазней серыя газетных нарысаў М. Энгеля, аднаго з аўтараў такіх паведамленняў, была апублікаваная як кніга.

Навуковая спадчына К. Касцюшкі-Валюжыніча складае велізарны архіўны фонд (больш за 5 тысяч адзінак захоўвання) – гэта копіі рукапісных справаздач, накіраваных у археалагічную камісію, фатаграфіі і чарцяжы, якія дакументуюць працэс раскопак, ліставанне з вядучымі навуковымі ўстановамі, гісторыкамі і прыватнымі асобамі. Да 2010 года частка архіўнага фонду Нацыянальнага запаведніка "Херсанес Таўрыцкі" была размешчаная ў адкрытым электронным доступе. Матэрыялы навуковага архіва К. Касцюшкі-Валюжыніча да гэтага часу служаць крыніцай для вывучэння гісторыі і археалогіі Херсанеса Таўрыцкага.

Херсанескія раскопкі з'яўляюцца ўнікальным помнікам і нязменна вабяць да сябе шматлікіх гасцей з розных краін. Сярод даследнікаў руін Херсанеса XX стагоддзя можна было б назваць імёны многіх археолагаў, але асновы сістэматычных раскопак заклаў менавіта Кароль Касцюшка-Валюжыніч. І яшчэ не адно пакаленне гісторыкаў будзе звяртацца да навуковай і творчай спадчыны першага загадчыка гарадзішча, выкарыстоўваць сабраныя ім матэрыялы і даследаваць помнікі, адкрытыя нашым вялікім суайчыннікам.

## ЗМЕСТ

ПРАДМОВА ..... 5

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ СТАРАЖЫТНАГА ХЕРСАНЕСА ..... 8

ПАЧАТАК ВЫВУЧЭННЯ КРЫМА ..... 14

"НЕ ХАВАЮ СВАЁЙ ЛІЦЬВІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦІ..." ..... 19

ПАД ХЕРСАНЕСКАЙ ЗОРКАЙ ..... 27

АДКРЫЦЦЮ СПАДАРОЖНІЧАЕ ТАЛЕНТ ..... 34

СПРАВА ЎСЯГО ЖЫЦЦЯ ..... 44

КАБ ЧАС НЕ ЗРУЙНАВАЎ ЗРОБЛЕНАГА ..... 49

ПАСЛЯСЛОЎЕ ..... 57

0+

НАШЫ СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ
Серыя акадэмічная

Навукова-папулярнае выданне

**Раманчук Ала, Ярмоленка Валер**
**АРХОНТ МЁРТВАГА ГОРАДА**

**Кароль Касцюшка-Валюжыніч**

Рэдактар *Алеся Станкевіч.* Макетаванне *Уладзя Бурымская.* Мастацкае афармленне *Віталь Катовіч.* Карэктар *Марыя Кавальчук.* Тэхнічны рэдактар *Алесь Дрыбін*

Падпісана да друку 25.08.17. Фармат 84×100 $^1/_{32}$. Папера афсетная. Гарнітура літаратурная. Ум. друк. арк. 3,12 + 0,78 укл. на крэйд. паперы. Ул.-выд. арк. 4,0. Наклад 750 паас. Замова № 39.

Выдавец і паліграфічнае выкананне НВК "Тэхналогія". Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы і распаўсюдніка друкаваных выданняў № 1/379 ад 01.07.14. Вул. Ляўкова, 19, 220007, Мінск.
e-mail: technalohija@gmail.com

## КНІГІ СЕРЫІ "НАШЫ СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ"

***Выйшлі з друку ў 1988–2017 гг.***

Грыбкоўскі В., Гапоненка В., Кісялёў У. **Прафесар электраграфіі і магнетызму**
Пра Якуба Наркевіча-Ёдку (1847–1905), адкрывальніка электраграфіі і бяздротавай перадачы электрычных сігналаў

Мархель У. **Вяшчун славы і волі**
Пра Уладзіслава Сыракомлю (1823–1862), выдатнага паэта-дэмакрата

Галакціёнаў С., Яцкевіч Г. **Рыцар навукі з Нянькава**
Пра Уладзіслава Дыбоўскага (1838–1910), таленавітага даследніка прыроды і фалькларыста

Арлоў У. **Асветніца з роду Усяслава**
Пра Еўфрасінню Полацкую (~ 1110–1173), беларускую асветніцу і рэлігійную дзеячку

Юхо Я. **За вольнасць нашу і вашу**
Пра Андрэя Тадэвуша Касцюшку (1746–1817), кіраўніка паўстання супраць маскоўскага панавання

Грыцкевіч В. **Адысея навагрудскай лекаркі**
Пра Саламею Русецкую, знакамітую лекарку і падарожніцу XVIII стагоддзя

Процька Т. **Эксперыментатар з Беластоцкай гімназіі**
Пра Караля Чаховіча (1832–1902), таленавітага вучонага-фізіка

Казбярук У. **Светлай волі зычны звон**
Пра Алеся Гаруна (1887–1920), выдатнага паэта, змагара за незалежнасць Беларусі

Тарасаў С. **Чарадзей сёмага веку Траяна**
Пра Усяслава Чарадзея (1044–1101), аднаго з найславуцейшых полацкіх князёў

Гусак А. **Практычная механіка і "Мёртвыя душы"**
Пра Мікалая Ястрэбскага (1808–1874), вучонага-інжынера, таленавітага літаратара

Саверчанка І. **Канцлер Вялікага Княства**
Пра Лева Сапегу (1557–1633), славутага палітычнага дзеяча, рэдактара Статута 1588 года

Бельскі А., Ткачоў М. **Вялікае мастацтва артылерыі**
Пра Казіміра Семяновіча (~ 1600–1651), вынаходніка шматступеневай ракеты

Сагановіч Г. **Айчыну сваю баронячы**
Пра Кастуся Астрожскага (1460–1530), славутага гетмана

Арлоў У. **Прысуд выканаў невядомы**
Пра Ігната Грынявіцкага (1856—1881), рэвалюцыянера-нарадавольца

Каханоўскі Г., Каханоўскі А. **Руплівец нашай старасветчыны**
Пра Яўстаха Тышкевіча (1814—1873), заснавальніка беларускага краязнаўства

Дабравольскі В. **Да ісціны — найпрацейшым шляхам**
Пра Васіля Ермакова (1845—1922), таленавітага вучонага-матэматыка

Гапоненка В. **У пошуках гармоніі Сусвету**
Пра Івана Яркоўскага (1844—1902), таленавітага вучонага-фізіка

Юхо Я., Емяльянчык У. **"Нарадзіўся я ліцьвінам..."**
Перапрацаванае і дапоўненае выданне пра А. Т. Касцюшку

Процька Т. **Даследчык таямніцаў святла**
Пра Аляксандра Садоўскага (1859—1923), таленавітага вучонага-фізіка

Саверчанка І. **Апостал яднання і веры**
Пра Язэпа Руцкага (1574—1637), выдатнага пісьменніка, педагога і рэлігійнага дзеяча

Янушкевіч Я. **Неадменны сакратар Адраджэння**
Пра Вацлава Ластоўскага (1883—1938), выдатнага палітычнага і культурнага дзеяча

Ярмоленка В. **За даляглядам Айкумены**
Пра Івана Чэрскага (1845—1892), славутага географа і падарожніка

Гапоненка В., Кіштымаў А. **Уладар гранічнага холаду**
Пра Жыгімонта Урублеўскага (1845—1888), таленавітага вучонага-фізіка

Процька Т. **Пакутнік за веру і Бацькаўшчыну**
Пра Мітрапаліта Мельхісэдэка (1876—1931), прыхільніка незалежнасці нашае праваслаўнае царквы

Чарняўскі М. **Правадыр крылатых вершнікаў**
Пра Яна Караля Хадкевіча (1560—1621), славутага гетмана

Болатаў А., Рыдзеўскі Г. **Ахвяруючы сябе Бацькаўшчыне**
Пра Аркадзя Смоліча (1891—1938), знакамітага вучонага-географа і нацыянальнага дзеяча

Лебедзева В. **Пуцявінамі змагання і пакутаў**
Пра Палуту Бадунову (1885—1938), дзяржаўную і палітычную дзяячку

Сіцька З. **Чалавек, які [illegible] у [illegible]**
Пра Ігната Дамейку (180[illegible]–[illegible]9), [illegible]ералога, нацыянальнага героя Чылі

Чарняўскі М. **Як пошуг ма[illegible]анк[illegible]**
Пра Расціслава Лапіцкага (192[illegible]–[illegible]50), кіраўніка антыкамуністычнай моладзевай арга[illegible]

Горбач А. **Песняй даваў людзям радасць**
Пра жыццё і творчасць выдатнага опернага спевака Міхася Забэйды-Суміцкага (1900–1981)

Гардзееў Ю. **Рамантык эпохі Асветніцтва**
Паказаны драматычны жыццёвы шлях Антона Тызенгаўза (1733–1785) – славутага рэфарматара эпохі Асветніцтва

Гапоненка В. **Каралева дакладных навук**
Пра Соф'ю Кавалеўскую (1850–1891) – таленавітага матэматыка і механіка, першай у свеце жанчыны-прафесара

Ярмоленка В. **За небасхілам спякотнага Турана**
Пра Мікалая Пржавальскага (1839–1888) – славутага падарожніка, першага даследніка Цэнтральнай Азіі

Чарняўскі М. **Як пошуг маланкі**
Другое, папраўленае выданне пра Расціслава Лапіцкага

Раманчук А., Ярмоленка В. **Архонт мёртвага горада**
Пра Караля Касцюшку-Валюжыніча (1847–1907) – заснавальніка і першага дырэктара музея старажытнага Херсанеса

НАШЫ
СЛАВУТЫЯ
ЗЕМЛЯКІ

*"Перліна ў кароне Візантыйскай імперыі..."*

*Камяні мёртвага горада*

*Дзе нарадзіўся Кароль?*

*Няскончанае навучанне ў Пецярбурзе*

*Праца на чыгунцы*

*Залатое дно для гістарычнай навукі*

*"Не хаваю сваёй ліцьвінскай нацыянальнасці..."*

*"Тут капаў, хто хацеў..."*

*Канфрантацыя з манастыром*

*Таямніцы старажытных напластаванняў*

*Унікальныя знаходкі*

*Страбон памыляўся*

*Сховішча антычных старажытнасцяў*

*Каб час не зруйнаваў зробленага*

ISBN 978-985-458-288-7
9 789854 582887